СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 5.51, 20.35, 14.44;
Віцебск — 5.37, 20.28, 14.51;
Магілёў — 5.41, 20.24, 14.43;
Гомель — 5.44, 20.15, 14.31;
Гродна — 6.09, 20.47, 14.38;
Брэст — 6.12, 20.45, 14.33.

МЕСЯЦ:
Поўня 13 жніўня.

ІМЯНІНЫ:
Другі Спас.
Юльяна, Баляслава

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

19 ЖНІЎНЯ 1992 г.
серада, № 164 (21942)

РОЗГАЛАС

КІТАЙ СТАЎ БЛІЖЭЙ

«Я задаволены вынікамі візіту ў Рэспубліку Беларусь, — сказаў намеснік старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Сайфуддзін. — Мы падрабязна праінфармавалі адзін аднаго аб працэсах, якія адбываюцца ў КНР і Беларусі, абмяняліся вопытам работы вышэйшых органаў дзяржаўнай улады, абмеркавалі асноўныя напрамкі знешнепалітычнай дзейнасці. Думаю, адносіны паміж нашымі краінамі будуць і далей умацоўвацца і развівацца».

Гэтую заяву Сайфуддзін зрабіў раніцай 18 жніўня перад адлётам кітайскай дэлегацыі ў Кіеў.

Высока ацанілі вынікі перагавораў і кіраўнікі Беларусі. На іх агульную думку, дружба з вялікім кітайскім народам, што склалася даўно і атрымала новы імпульс пасля ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі, цяпер, напэўна, прынясе ўзаемавыгадную аддачу. КНР выдзеліла Беларусі крэдыт у памеры 30 мільёнаў юаняў, дасягнута папярэдняя дагаворанасць аб пастаўцы некаторай беларускай прадукцыі Кітаю.

БЕЛІНФАРМ.

АБ'ЯДНАННЕ КАРЭІ: ПАЗІЦЫЯ БЕЛАРУСІ

18 жніўня раніцай Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслаў Шушкевіч і акадэмік рэспубліканскай Акадэміі навук Анатоль Міхайлаў з аэрапорта «Мінск-2» вылецелі ў Маскву, адкуль накіраваліся ў Паўднёвую Карэю для ўдзелу ў пасяджэнні Савета палітычных лідэраў дзяржаў па праблемах сучаснага свету.

Напярэдадні Станіслаў Шушкевіч у інтэрв'ю карэспандэнту БелаПАНа паведаміў, што ў Сеуле будуць абмяркоўвацца палітычныя, прававыя і іншыя аспекты аб'яднання Паўночнай і Паўднёвай Карэі. «Мы хацелі б удзельнічаць у гэтай размове,— падкрэсліў Старшыня беларускага парламента. — Не ведаю, наколькі магчыма тут праводзіць паралелі, але гэта факт: рэспублікі былога СССР праз раз'яднанне, а абедзве Карэі — праз аб'яднанне ідзём у міжнародную супольнасць».

Як даведаўся карэспандэнт БелаПАНа, плануецца выступленне С. Шушкевіча на сеульскім пасяджэнні з дакладам, распрацаваным групай экспертаў Вярхоўнага Савета Беларусі.

Алесь ЛІПАЙ.
(БелаПАН).

МЫ І НАША НАЦЫЯНАЛЬНАЯ СВЯДОМАСЦЬ

Сёння ў Маладзечна пачала працаваць Міжнародная навуковая канферэнцыя «Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў».

У яе арганізацыі прынялі ўдзел Беларускі дзяржаўны універсітэт, Маладзечанскі гарвыканком, Міжнародная асацыяцыя баларусістаў, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Францыска Скарыны. Дабрадзеямі навуковай канферэнцыі сталі Беларускі інстытут навукі і мастацтва (БІНіМ) у Нью-Йорку, Маладзечанскі бізнес-цэнтр, Міжнародная школа беларускай мовы, літаратуры і культуры ў Мінску і Радашковіцкі завод мастацкай керамікі.

У рабоце канферэнцыі прымаюць удзел як вядомыя айчынныя вучоныя, так і госці з ЗША, Англіі, Польшчы, Германіі.

Надзвычай актуальная для сённяшняй Беларусі, станаўлення яе незалежнасці тэма канферэнцыі. Менавіта недастатковая нацыянальная самасвядомасць беларусаў, як лічаць многія, перашкаджае нашаму працавітаму, цярпліваму і талерантнаму народу адрадзіць сваю гістарычную спадчыну і памяць, заняць належнае месца ў сям'і еўрапейскіх народаў. Цяжка не згадзіцца з такім меркаваннем. Бо нават цяпер, калі Беларусь стала незалежнай, а беларуская мова— дзяржаўнай, людзі не надта імкнуцца гаварыць на сваёй роднай мове. Сітуацыя, як мяркуюць вучоныя, складваецца цяпер так, што будучыня Беларусі амаль цалкам залежыць ад саміх беларусаў.

З грунтоўнымі дакладамі ў першы дзень канферэнцыі выступяць доктар філасофскіх навук Уладзімір Конан, доктар навук з Нью-Йорка Янка Запруднік і гісторык з Маладзечна Мікола Ермаловіч.

Работа канферэнцыі будзе праходзіць па трох секцыях — «Вопыт гісторыі», «Шляхі адраджэння» і «Мова, мастацкае слова, рэлігія».

У чытальні цэнтральнай гарадской бібліятэкі 20 жніўня адбудзецца прэс-канферэнцыя для журналістаў.

Падрабязны матэрыял пра работу Міжнароднай канферэнцыі будзе змешчаны ў газеце.

Таццяна АНТОНАВА.

БАБРУЙСКАЯ ТАНКАВАЯ АРМІЯ: ДАСТОЙНЫ ФІНАЛ?

Прыйшло, здаецца, свята і на вуліцу «крыкуноў» Бабруйскай танкавай арміі — Ю. Далматава, С. Марозава, В. Шэнера, У. Мельніка — зняты з пасады камандуючага арміяй генерал-лейтэнант С. Румянцаў. Увогуле армія як такая перастала існаваць — стаў механізаваны корпус. Ці знікла разам з гэтым пераўтварэннем «дзедаўшчына» ў вышэйшых эшалонах улады цяпер ужо корпуса — пакажа час. Па неправераных даных на чале корпуса стане генерал-маёр Усхобчык.

Штаб жа корпуса будзе ў 5 разоў меншы, чым у танкавай арміі. З камандным саставам неяк разабраліся. А як жа «крыкуны»?

Як паведамляла ўжо «Звязда», падпалкоўнік Ю. Далматаў быў «незразумела» звольнены з радоў узброеных сіл рэспублікі. Аб гэтым сведчыць і прадстаўленне ваеннай пракуратуры былому камандуючаму БВА «Аб службовых злоўжываннях шэрагу службовых асоб ТА»: «...Апошні (Ю. Далматаў.— **Аўт.**) беспадстаўна аддадзены афіцэрскаму таварыскаму суду часці, датэрмінова пераатэставаны і прадстаўлены да звальнення ў запас.

Здавалася б, міністр абароны, які быў літаральна тыдзень назад у Бабруйску, адновіць справядлівасць. Дзе там. Павел Казлоўскі заяўляе апальнаму падпалкоўніку, што загаду аб звальненні адмяняць не збіраецца.

Вось такая пакуль справядлівасць. Сам Ю. Далматаў збіраецца падаць у суд на міністра абароны. Так што свята на вуліцы «крыкуноў» будзем лічыць няпоўным.

Аб далейшых падзеях у былой «скандальнай» арміі, а цяпер корпусе, мы паведамім дадаткова.

Аляксандр КОКТЫШ.

Ніводнага адмоўніка за тры гады

па Бабруйскаму аб'яднанаму ваенкамату. Гэтым фактам абрадаваў нас ваенны камісар палкоўнік Віктар Калатвін. Прычыну ён тлумачыць проста: пераважная колькасць прызыўнікоў ідзе з сельскай мясцовасці, а там моладзь мае ў цэлым нядрэнную патрыятычную загартоўку.

А ці ёсць «бегуны»? На жаль, сустракаюцца. Як правіла, гэта тыя беларускія хлопцы, якія служаць у Расіі. Аднак з'явіліся «ўцекачы» і з Беларускага войска. Літаральна гэтымі днямі два салдаты пакінулі батальён, размешчаны ў Гродна. Скардзяцца на «дзедаўшчыну». Яшчэ адзін салдат з'явіўся на парозе ваенкамата з Асіповічаў. Прычына — тая ж.

У. ЦАСЮК.

ФАКТЫ ВЕДЫЁ

Старажытны водны шлях з Брэста ў Варшаву ёсць магчымасць аднавіць, і ён будзе служыць эканоміцы суседніх краін, лічаць спецыялісты. Больш таго, калі знайсці сродкі, то гэта можна зрабіць усяго за два гады. У першую чаргу неабходна паглыбіць фарватэр Заходняга Буга, пабудаваць шлюзавыя сістэмы. Так што, верагодна, у недалёкім будучым перад доўгай аўтамабільнай чаргой перавага будзе аддадзена камфартабельнаму пасажырскаму цеплаходу «Брэст — Варшава».

***

За кур'ёз, напэўна, можна было прыняць паведамленне «Радыёфакта» аб тым, што буйнейшы і адзіны ў рэспубліцы вытворца трыкатажу — пінскае прамыслова-гандлёвае аб'яднанне «Палессе» пачало выкарыстоўваць свае актавыя і спартыўныя залы як склады для прадукцыі. Але, на жаль, не задавальненнем спажывецкага попыту тлумачыцца гэты парадокс, а ростам цэн у сярэднім у 9 разоў. Некалі папулярныя пінскія трыкатажныя вырабы сёння не па кішэні радавому пакупніку. Аднак гігант-манапаліст не ідзе на ўступкі гандлю, а клапоціцца, галоўным чынам, пра ўласны дабрабыт: месячны заработак у рабочых склаў тут у ліпені больш як 11 тысяч рублёў.

***

Не мінулі і два месяцы пасля грашовай рэформы ў Эстоніі, а на індустрыяльнай поўначы гэтай рэспублікі зноў фінансавы крызіс. З-за дэфіцыту наяўнасці спынена выдача дапамогі пенсіянерам. Гандлю рэкамендавана адпускаць людзям пажылога ўзросту прадукты харчавання па запісах у даўгавых кнігах сумы пакупкі і пашпартных даных;

***

Магчымасць купіць паўтара кілаграма цукру па 15 рублёў і 20 пачак цыгарэт «Апал» па 5—6 рублёў прадаставіць адміністрацыя Пермскай вобласці кожнаму студэнту, які пажадае аказаць шэфскую дапамогу вёсцы ў чарговай бітве за ўраджай.

У гонар славянскіх асветнікаў

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Пагост-Загародскай сярэдняй школе Пінскага раёна прысвоена імя вялікіх славянскіх асветнікаў Кірыла і Мяфодзія.

Летась у Загародскім сельскім Савеце пабываў консул Балгарыі ў Мінску Пётр Куцараў. Ён наведаў праваслаўную царкву, што была закладзена ў гонар гэтых славянскіх асветнікаў. Ім было прапанавана больш актыўна развіваць культурна-асветніцкія сувязі паміж Беларуссю і Балгарыяй. Ідэя знайшла паслядоўнікаў. І вось Пагост-Загародскай школе прысвоена імя Кірыла і Мяфодзія.

Зараз тут рыхтуецца памяшканне для музея ў гонар славянскіх асветнікаў.

Уладзімір МАКАРЭВІЧ.

ІРВЁМСЯ Ў ЕЎРОПУ

ГРОДНА. (А. Дук). Прадпрыемствы вобласці за першыя шэсць месяцаў гэтага года паставілі ў 29 краін свету тавараў на 1 млрд. 378,8 млн. рублёў. 2,6 працэнта склалі пастаўкі машын і абсталявання, а 97,4 працэнта прыпадаюць на сыравіну і тавары народнага спажывання. Акрамя таго, за гэты ж перыяд сумесныя прадпрыемствы Гродзеншчыны вырабілі прадукцыі і аказалі паслуг на 84,1 мільёна рублёў. Экспарт іх прадукцыі склаў амаль 275 тысяч долараў.

УРАЧЫСТАСЦІ БУДУЦЬ

*** Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт дазволіў Управе БНФ правесці ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды першай гадавіны з дня падаўлення жнівеньскага путчу і надання Дэкларацыі аб незалежнасці Беларусі канстытуцыйнай сілы. Мітынг-свята з удзелам спевакоў і паэтаў пройдзе 25 жніўня на плошчы Незалежнасці ў Мінску. Пачатак— у 18 гадзін 30 хвілін.**

ВАКОЛ ПУТЧУ

Мінуў роўна год з тых жніўеньскіх падзей, якія потым атрымалі назву «путч». Прапануем вам некалькі малавядомых і ў чымсьці кур'ёзных фактаў, звязаных з ім.

Адэскі фальшываманетны двор (так цяпер называецца «Саюздрук» горада на Чорным моры) выпусціў у абарот купюру «апошні чацвяртны», прысвечаную гадавіне так званага дзяржаўнага перавароту. На адным баку намаляваны стол, за якім сядзяць восем Сталіных пад чырвоным сцягам з надпісам «ГКЧП» і надпісам унізе: «Хунт стэрлінгаў». Наменклатурнае ўтрыманне: восем пэскуда». На адваротным баку — малюнак Георгія Пабеданосца і надпіс «Адзін Ельцын са таварышы». Новыя банкноты карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў рэгіёне, але не маюць ніякага практычнага значэння.

***

Група сацыёлагаў з Масквы падлічыла, што калі браць за аснову ўспаміны тых, хто на вядомым камуністычным суботніку быццам бы нёс бервяно разам з Леніным, то колькасць такіх «памочнікаў» складзе каля 800 чалавек. Чарговая распрацоўка спецыялістаў — падлік «абаронцаў» «Белага дома» 19—21 жніўня 1991 года. Калі верыць усім тым, хто заяўляе аб сваім знаходжанні там у дні путчу, то агульная колькасць людзей на плошчы перад «Белым домам» складзе каля 5 мільёнаў чалавек. Гэта прыкладна кожны пяцьдзесят шосты жыхар СНД пры тым, што плошча Ўмяшчае ўсяго 100 тысяч чалавек. Такім чынам, плошча выступіла ў ролі бервяна.

***

Калі быў створаны ГКЧП, Ельцын тэрмінова сфарміраваў запасны ўрад і накіраваў яго ў Свярдлоўск. Урад складаўся, у асноўным, з намеснікаў міністраў СССР. Цікава, што большасць з іх на момант фарміравання гэтага своеасаблівага «антыкамуністычнага» ўрада мелі ў кішэні партыйныя білеты.

Толькі пятая частка мінскіх СП дае прадукцыю

МІНСК. Паводле даных гарадскога ўпраўлення статыстыкі, у сталіцы Беларусі зарэгістравана 270 сумесных прадпрыемстваў, з якіх 74 распачалі дзейнасць, а 57 ужо даюць прадукцыю. Доля замежных партнёраў у статутным фондзе СП складае каля 70 працэнтаў, а працуе ў мінскіх сумесных прадпрыемствах звыш 4.700 чалавек.

Амаль на працягу месяца трыццаць хлопчыкаў і дзяўчынак з Гомельскай вобласці лячыліся і адпачывалі ў Бельгіі. Учора ў суправаджэнні гасцінных гаспадароў яны вярнуліся ў Мінск. Адразу было бачна, што дзеці добра правялі час. Яны весела ўсміхаліся, жартавалі і марылі... зноў пабываць у Бельгіі.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

Патрабаванне часу — згода!

ВЫЙШАЎ ПЕРШЫ НУМАР БЕЛАРУСКАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ГАЗЕТЫ «ЗГОДА»

Партыя народнай згоды робіць у палітычным жыцці краіны толькі першыя крокі, але ўжо можна сказаць, што яна стала прыкметнай сілай. Няпростым быў шлях станаўлення, праведзена вялікая работа, мяняліся людзі, але асноўным заставалася ідэя — шлях эвалюцыйнага змянення грамадства без пераваротаў і рэвалюцый.

Сёння на Беларусі афіцыяльна дзейнічае 8 палітычных партый, але ўсяго дзве ці тры з іх маюць уласныя друкаваныя сродкі, якія толькі час ад часу з'яўляюцца ў продажы. Вядома ж, нельга гаварыць аб іх як аб альтэрнатыўнай крыніцы інфармавання народа.

Менавіта са стварэння такой альтэрнатыўнай крыніцы і вырашыла пачаць сваю актыўную дзейнасць Партыя народнай згоды. Час выбраны вельмі зручны, на парозе — восень, якая абяцае быць вельмі «гарачай». Знайшліся спонсары, адразу некалькі прамысловых прадпрыемстваў выдзелілі сродкі на выданне. Газета адрасавана шырокаму колу людзей. Цікава, што за гэтую справу ўзяліся не прафесіяналы - журналісты, а гісторыкі, палітолагі Леанід Лойка і Аляксей Кароль. Чаму так? Для іх вельмі важнай аказалася сама ідэя, яны яе выношвалі, фармулявалі і вось вырашылі паспрабаваць.

Паколькі задача ПНЗ не разбурэнне, а стварэнне, то адпаведная задача і новай газеты. Рэдактары лічаць, што цяпер патрэбна газета з палітычным аналізам падзей. Вялікая ўвага будзе ўдзелена і эканамічнаму жыццю. ПНЗ лічыць сябе канструктыўнай апазіцыяй ураду і цяперашнім органам улады, і гэта вызначае падыход рэдакцыі да аналізу падзей у рэспубліцы. Газета зарыентавана ў першую чаргу на шырокія колы інтэлігенцыі, якая хацела б бачыць далейшае развіццё падзей паступальным шляхам. У гэтай сувязі плануюцца добрыя тэарэтычныя артыкулы па пытан-

(Заканчэнне на 3-й стар.).

АБ'ЕКТЫЎНА ПРА АБЫЯКАВАСЦЬ

Беларускі Арал

Ёсць у Баранавіцкім раёне аўтатурбаза «Лясное возера». Цудоўнае, прыгожае месца. Штогод тут адпачывалі дарослыя і дзеці з розных куткоў Беларусі, а таксама з краін былога СССР. Толькі вось сёлета турбаза не запоўнена адпачываючымі. Хацелі зрабіць як найлепш, а атрымалася наадварот. Некалькі гадоў назад было вырашана ачысціць 36-гектарнае возера, якое належыць турбазе. Яшчэ ў 1938 годзе тут была пабудавана дамба, некалі працавала невялічкая электрастанцыя. З тых часоў у возеры ўтварылася значная колькасць сапрапелі, якую таксама можна было б выкарыстаць з карысцю. Дарэчы, зрабіць гэта і планавалі. Трэст «Пінскводбуд» узяўся за работу, адвёў ваду з возера, падсыпаў дарогу... і на гэтым усё спынілася. Знайшлося апраўданне: калі год назад запланаваныя работы каштавалі адзін мільён рублёў, то зараз яны «цягнуць» на ўсе 26 мільёнаў. Вось і ламае галаву дырэктар турбазы Васіль Аляксандравіч Шарапаў, дзе ўзяць такую суму. Сумна глядзець на тое, што тут зроблена, які выгляд мае возера. Прыкра думаць, што можа загінуць яшчэ адзін прывабны куток Беларусі. Турбаза «Лясное возера» магла б паслужыць добрым месцам адпачынку, якіх пасля развалу СССР так не хапае рэспубліцы. Але ж які адпачынак без возера. Вось факты: калі ў мінулыя гады тут адпачывала звыш 1.200 чалавек у месяц (колькасць месц 707), дык сёлета — не больш чатырохсот. І гэта ў той час калі няма дзе адпачыць на канікулах дзецям з чарнобыльскай зоны, калі мы спадзяёмся ў гэтай справе на замежнага дзядзьку. А можа, самім трэба быць больш гаспадарлівымі, дбаць пра сваю зямлю і саміх сябе? Нельга губляць, разбураць тое, што ўжо ёсць. А аўтатурбаза «Лясное возера» просіць дапамогі, паратунку. Добра было б, каб на гэтую просьбу адгукнуліся тыя, хто павінен давесці справу да канца.

НА ЗДЫМКАХ: такі выгляд мае возера цяпер.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

ЗУБР, ЛОСЬ І БАБЁР ВЫХОДЗЯЦЬ НА СЦЕЖКУ ЭМІСІІ

У хуткім часе ў абарачэнне паступяць новыя купюры Нацыянальнага банка рэспублікі — разліковыя білеты наміналам 3, 25 і 100 рублёў. На грашовых знаках такой вартасці будуць адлюстраваны адпаведна бабёр, лось і зубр.

Карэспандэнт БелаПАНа папрасіў пракаментаваць гэты факт начальніка ўпраўлення эмісійна-касавых работ Нацыянальнага банка Беларусі Уладзіміра СІНЬКО.

— Нацыянальны банк і Савет Міністраў рэспублікі прынялі рашэнне аб увядзенні беларускага рубля як плацежнага сродку на тэрыторыі рэспублікі 25 мая, — сказаў Уладзімір Яраслававіч. — Іх з'яўленне садзейнічала вырашэнню праблемы наяўных грошай, зняццю напружанасці ў выплаце заработнай платы працоўным, часткова — абароне спажывецкага рынку ад вывазу тавараў. Абапіраючыся на сусветны вопыт, мы ажыццяўляем гэты працэс у два этапы. На першым былі ўведзены наміналы, якія часцей за ўсё знаходзяцца ў абарачэнні, — 50 капеек, 1, 5, 10 і 50 рублёў. У наменклатуры адразу былі распрацаваны знакі вартасцю 3, 25 і 100 рублёў. Іх увод у абарачэнне адбудзецца на другім этапе. Прагучаўшае па радыё паведамленне аб тым, што рыхтуецца да выпуску купюра вартасцю 250 рублёў, не мае пад сабой падстаў.

— Якая колькасць новых знакаў будзе выпушчана?

— Гэта не падлягае абвяшчэнню.

— Значыць, дэфіцыту наяўных грошай сёння не назіраецца?

— Так, гэтае пытанне вырашана. Выплачаны ўсе запазычанасці па заработнай плаце, пенсіях і датацыях.

— Ці магчыма, што з уступленнем Беларусі ў Міжнародны валютны фонд і Сусветны банк рэканструкцыі і развіцця наш «зубр» калі-небудзь стане нацыянальнай валютай?

— Увядзенне нацыянальнай валюты — складаны працэс і залежыць ад стану эканомікі, інфляцыі, многіх іншых фактараў. Пакуль мы не гатовы да гэтага. Уступіўшы ў названыя вамі арганізацыі, мы зможам пераймаць іх вопыт і тэхналогію, што, несумненна, дапаможа нам стабілізаваць фінансавае становішча і эканоміку ў цэлым.

— Але як хутка мы зможам убачыць новыя купюры?

— Нацыянальным банкам зроблены заказ, і цяпер усё залежыць ад аператыўнасці выканаўцы заказу. Спадзяюся, што чакаць засталося нядоўга.

Гутарыў Аляксандр МАЛЧАНАЎ.

Сеяць і жаць трэба ў любых умовах і пры любых абставінах

Асобныя гаспадаркі Гомельшчыны ўжо завяршылі ўборку збожжавых, якія парадавалі добрым ураджаем. У калгасе «Лапацінскі» і саўгасе «Бабовіцкі» Гомельскага раёна сабрана звыш сарака цэнтнераў з гектара, а самы высокі намалот у калгасе «Шлях да камунізму» Добрушскага раёна — каля 50 цэнтнераў. Мяркуецца, што на гэтым тыдні ўборку збажыны закончаць усе гаспадаркі вобласці. Сёння на круг выходзіць па 32,4 цэнтнера, і ёсць надзея, што гэтая лічба не знізіцца да канца ўборкі. Зараз яна вышэйшая за мінулагодні паказчык. Радуе хлебаробаў і вышэйшы за спрагназіраваны спецыялістамі ўраджай перад пачаткам жніва. Таму першае пытанне, якое я задаў старшыні аблсельгасхарча Уладзіміру Міхайлавічу Слесару і яго намесніку па расліна-водству Івану Фёдаравічу Раманаву, было такое:

— Якія ўрокі сёлетняй збожжавай эпапеі?

— Вядома, што надвор'е доўгі час спрыяла развіццю збожжавых культур у нашай вобласці. Але на апошнім этапе пашкодзіла: невыносная, моцная засуха намнога знізіла ўраджайнасць. Па-другое, практыка паказала, што там, дзе сапраўды дбайна адносіліся да справы з першапачатковага этапа закладкі новага ўраджаю, дасягнулі поспехаў нават на «бедных» глебах. Вось толькі адзін характэрны прыклад. У другім аддзяленні саўгаса «Жыткавіцкі» Жыткавіцкага раёна збожжавыя былі пасеяны ледзь не на сыпучых пясках. А ўраджайнасць там дасягнула 35 цэнтнераў з гектара. За кошт таго, што зямлю тут своечасова апрацавалі па ўсёй тэхналогіі, далі ёй поўную запраўку мінеральнымі і арганічнымі ўгнаеннямі, а затым правялі і двухразовую падкормку. Тое ж самае зрабілі і ў іншых гаспадарках. Там жа, дзе тэхналогіі вырошчвання раслін па розных прычынах не ўдзялілі належнай увагі, пры аднолькавых умовах надвор'я і пры большай бальнасці глебы ўраджай сабралі значна меншы.

Сёння пра гэта даводзіцца гаварыць таму, што зараз у вобласці ўжо трэба праводзіць падрыхтоўку да сяўбы азімых. Пастаўлена задача — атрымаць у будучым годзе з кожнага гектара па 35 цэнтнераў збожжавых. У асобных гаспадарках лічаць гэтую лічбу недасягальнай, але вопытныя спецыялісты даказваюць адваротнае і робяць такую раскладку. Нельга ўпускаць час, неабходна пачынаць лушчэнне ржышча. Ва ўмовах сёлетняй спёкі, калі зямля высушана, вельмі важна захаваць нават самыя малыя грамы вільгаці, таму апрацоўка глебы павінна быць безадвальнай.

У яе ляжа элітнае насенне, якое дачакаецца дажджоў. А восенню — запраўка глебы мінеральнымі і арганічнымі ўгнаеннямі. У мінулым годзе пад сёлетні ўраджай іх было ўнесена 1.900 тысяч тон. Пад ураджай 1993 года гаспадаркі вобласці плануюць унесці іх пры той жа плошчы пасеваў 1.263 тысячы тон. Чаму? Сіл для гэтых работ дзе-нідзе не хапае, ды і кіраўнікі асобных калгасаў і саўгасаў кажуць: вельмі дарагія ўгнаенні. Усё гэта так. Але нельга адкінуць убок і тое, што ўгнаенні не падзешавеюць, і тое, што зэканомлены зараз рубель на наступны год, калі не пусціць яго ў справу, а трымаць у кішэні, не дасць ніякага прыбытку. Прыклад з саўгасам «Жыткавіцкі» — пераканаўчы доказ таму. І аб гэтым нельга забываць кіраўнікам рада гаспадарак Брагінскага, Жлобінскага, Калінкавіцкага, Петрыкаўскага і Хойніцкага раёнаў, якія даслалі ў аб'яднанне «Сельгасхімія» тэлеграмы аб адмове ад фондаў мінеральных угнаенняў на трэці і чацвёрты кварталы.

Сёлета, паводле папярэдніх разлікаў, вобласць атрымае збожжа на 370 тысяч тон больш, чым летась, але затое значна недабярэ травяністых кармоў. Частка збожжа пойдзе на кармавыя мэты грамадскага статка. Аднак і гэтага будзе недастаткова для сытнай зімоўкі. Таму вельмі важна ўбраць з палёў салому, належным чынам апрацаваць. І яна таксама пойдзе на корм. Толькі з гэтым не спяшаюцца ў Гомельскім, Рэчыцкім, Добрушскім і іншых раёнах. Вялікая частка саломы яшчэ знаходзіцца на палях — незасцёртаная і незацюкаваная. Пакуль не пайшлі дажджы, яе трэба прывесці ў парадак. Многіх кіраўнікоў гаспадарак непакоіла пытанне нізкіх цэн на закуп дзяржавай збожжа. Відаць, таму з планавых 266 тысяч тон яго пакуль здадзена не больш 200 тысяч тон. Калгасы і саўгасы пакрысе здаюць яго на прыёмныя пункты, бо кожная машына, кожны прычэп — гэта дзесяткі тысяч рублёў, а значыць, хоць і маленькі, але крок да таго, каб неяк злезці з небяспечнай вышыні знакамітай картатэкі. Толькі ці дапаможа гэта хлебаробам у будучым?

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Пульс правінцыі: пачашчаны

НАТАТКІ ГАРАДЖАНІНА НА АДПАЧЫНКУ

У сэнсе палітычным мае землякі ствараюць даволі стракатую карціну. Да таго, што пачынае мільгацець у вачах, і вывесці з усяго гэтага нейкую заканамернасць вельмі цяжка. Уласна, пры ўсёй стракатасці поглядаў, ясна становіцца толькі тое, што палітыка надакучыла. У час усемагчымых «парці» і «рандэву» пачынаюць дыскусіі звычайна ж з палітыкі, але хутка хтосьці ўносіць прапанову: «Ды што вы адно і тое ж? Давайце лепш пра баб!». На «бабах» таксама не спыняюцца, далей — цэны, грошы, купоны, віды на ўраджай і г. д.

Як я зразумеў, зараз ніводзін палітык не карыстаецца павагай землякоў. Многія прапануюць судзіць Гарбачова «за тое, што разваліў краіну», некаторыя далучаюць да былога прэзідэнта СССР існуючага — Расіі. Усе як адзін (з тых, з кім гаварыў) выказваюцца за суд над вышэйшымі асобамі КПСС, большасць ужо «вынесла прыгавор» — расстраляць.

Неяк убаку застаюцца беларускія палітыкі. З іх вызначаюцца найбольш Шушкевіч і Кебіч, прычым апошні — як бы ў цяні. Народ звязвае нейкія свае надзеі, калі яны маюць месца, са Станіславам Станіслававічам. Праўда, пры гэтым робіцца заўвага: «Трэба каб ён вызначыўся, а то не разумееш — за каго ён». Як бачна, землякі дагэтуль дзеляць свет на «белых» і «чырвоных». Гэтак прасцей, хоць не сказаць, што правільна. Наогул, аб палітычных лідэрах рэспублікі гаворыцца мала і неяк несур'ёзна. Няма яркіх? Магчыма. Але мне здаецца, што гэта не больш чым легенда, міф, выгадны старому кіраўніцтву Беларусі. Мы не выдатныя, дык і іншыя таксама — прыкладна такая логіка. Наяўнасць на палітычным небасхіле такіх фігур, як Шушкевіч ці Пазьняк (нават з усімі іх хібамі), якраз і абвяргае той міф.

А вось што ён упаў на падрыхтаваную глебу, тут сумненняў няма. І зусім невыпадкова мае землякі Гарбачова з Ельцыным памінаюць часцей, чым Кебіча з Шушкевічам.

Не трэба забываць, што імперыя развалілася (юрыдычна) толькі ў мінулагоднім снежні. У псіхалогіі людзей гэты працэс зойме некалькі дзесяцігоддзяў.

Не трэба забываць, што толькі два гады назад праходзіў рэферэндум аб лёсе Саюза і за некалькі кіламетраў ад пасёлка праходзіла традыцыйная сустрэча прадстаўнікоў трох рэспублік. І ўсе яны, нагадаю, разглядаліся як адзінае цэлае. І пытанняў не было: цэлае дык цэлае. І перажыць гэты злом — аб'яўленне незалежнасці — відаць, няпроста.

Інерцыя гісторыі прымушае людзей глядзець у бок Масквы: што скажуць там. Бела-чырвона-белы сцяг над пассаветам, па сутнасці, нічога не вырашае. Справа не ў тым, што Гомельская, Магілёўская і частка Віцебскай абласцей да сярэдзіны 20-х гадоў уваходзілі ў склад РСФСР. Корань праблемы: на працягу многіх дзесяткаў гадоў апошняе слова заставалася за Масквой. Мясцовыя палітыкі ў лепшым выпадку ўспрымаліся як прыдатак, неабходны антураж. Для ілюзіі самастойнасці.

А адсюль — на жаль, усё астатняе. І мова, і культура, і нацыянальная самасвядомасць. Якія і цяпер, пасля прыняцця адпаведных дзяржаўных актаў і законаў застаюцца для сярэднестатыстычнага беларуса «тэра інкогніта»...

Сустракаю на вуліцы знаёмага, разам вучыліся, нават сябравалі некаторы час. Таму я магу разлічваць на яго шчырасць.

— Ды што гэта за мова, даруй Божа?! Нейкая вясковая. Чытаеш — палову не разумееш.

— А ты спрабаваў разумець?

— Навошта? Мне і рускай хапае. Усе на рускай размаўляюць, што я, дурнейшы за ўсіх?

— Хм. У цябе ж у пашпарце напісана «беларус».

— Рускі!

— Тым больш.

— Што тым больш? А-а, ідзі ты са сваёй мовай...

Газеты, я ведаю, ён чытае, напэўна, беларускае тэлебачанне глядзіць. Здавалася б, адкуль такая пагарда пры поўнай адсутнасці логікі? Вушы растуць усё адтуль жа.

Пушкін — гэта галава (ранней), Салжаніцын — гэта галава (цяпер). Купалы з Коласамі — смех дый годзе. І што тут скажаш? Будзеш тлумачыць, што Купала і Колас — не смех, што так было задумана: Пушкін з Талстым — 90 працэнтаў, астатняе Коласу з Купалам? Што сувымяраць маштаб таленту — справа шкодная і недарэчная. І калі для рускіх — Пушкін, то для нас — Купала? І што ў гэтым сэнсе паміж імі з поўным правам можна ставіць знак роўнасці? Не зразумеюць мяне. Вось менавіта сёння — не зразумеюць. Так нас усіх вучылі, убівалі ў галаву — так лёгка з гэтым не развітаешся.

Нічога супраць Аляксандра Сяргеевіча з Аляксандрам Ісаевічам не маю, яны мне падабаюцца абодва. Разам з тым, я павінен помніць, дзе я нарадзіўся і хто з'яўляецца маім духоўным бацькам. Так было б трэба і пажадана. Такога няма. Дык што ж дзіўнага, што беларус іншы раз больш рускі, чым сам рускі, што ён перажывае за Курылы і Паўднёвую Асецію, хоць якая б яму справа?

Я памятаю, як у нас у пасёлку святкавалі савецкія святы. Музыка, мітынг у парку, урачыстыя даклады, мноства народу. А вось наша свята, чыста беларускае — Дзень незалежнасці. На стадыёне — гандаль: машыны, кіёскі, латкі. Прадаваць — асаблівых дэфіцытаў не прадаюць. Мо толькі адносна танны партвейн «тры сямёркі». Пакуль яго не расхапалі, было шматлюддзе. Потым паціху разбрыліся: палова п'яная ад партвейну, палова — ад страшэннай спякоты. І адно засталося ад «светлага дня» — галаўны боль.

Зразумела, нельга чакаць імгненнага пакланення новым святыням — гэта заўсёды дрэнна пахне. Так што менш за ўсё трэба вінаваціць людзей. Пуставата стала ў душы, а менталітэт патрабуе новых «абразоў». Англічанін або француз можа верыць у Бога ці не верыць, да палітыкаў жа ставіцца прагматычна: адносна іх пытання аб веры не стаіць. Нам без веры ў чарговага збавіцеля адзінока, сумна і страшна. Заўважце, як арганізавана мы паверылі ў Бога, нават з выклікам нейкім. А разабрацца, шчырасці тут не больш, чым раней. Той, хто верыў у Бога да 1985 года, верыць і зараз. Большасць кінулася даверы ад страху і разгубленасці, часткова па прычыне моды. Дайце новага месію — пачнецца зваротны працэс. Вось гэта сапраўды страшна. Бо ніхто не дасць гарантыі, што месія раптам не крыкне «Хайль я!».

Усё гэта: надзеі і расчараванні, свежы вецер і подых новай навальніцы — адбылося за апошнія два-тры гады. Памятаю, якая вайна ішла на першых больш-менш свабодных (адносна, канешне) выбарах. Былі тры туры, першы сакратар і старшыня райвыканкома біліся як ільвы, а які вынік? Выбралі чалавека, якога ніхто не ведаў, першы сакратар перамясціўся ў Гомель, а старшыню райвыканкома ледзь не выперлі з раёна і толькі слёзныя просьбы дапамаглі яму застацца «дома», але на трэціх ролях. Натуральна, народ зрабіў вывад: праўды няма. Нічога не мяняецца, а значыць, не бяры ў галаву і глядзі сябе. Можаш абдурыць — дуры, усе так робяць. Можаш украсці — крадзі, усе крадуць. Адным словам, прыстасоўвайся да абставін і нікому не вер...

Ведаеце, што больш за ўсё ўразіла мяне дома? Цішыня ў лазні. Ні табе анекдотаў, ні баек, ні «вытрымак» з уласных прыгод, ні жывой дыскусіі аб шляхах выхаду краіны з крызісу. Мёртвая цішыня ў прылазніку. Мужыкі сядзяць моўчкі, і кожны заняты сваімі думкамі. Не вельмі вясёлымі, відаць. Нават не што будзе заўтра, а што — сёння вечарам, і як з гэтага выкруціцца, і што наогул рабіць, каб спаць спакойна?

Уласна, асаблівай трагедыі тут няма. Калі чалавек задумваецца, то гэта ва ўсіх выпадках лепш, чым не думаць. Калі задумаўся, то нешта прыдумае. Важна толькі ягоныя думкі накіраваць у станоўчы бок. А то надумае: падарве гранатай пассавет па прычыне бязвыхаднага становішча. А можа, пойдзе, накапае бульбы і паедзе ў горад, забяспечваць пралетарыят «другім хлебам» па рыначных цэнах. Тут як павернеш і што мужыку спадабаецца: бурыць ушчэнт недабуранае ці ствараць штосьці новае.

Небяспечны момант, як кажуць, «фіфці-фіфці». Мне здаецца, не трэба мужыку перашкаджаць думаць. Ён сам разбярэцца: заяваць ці будаваць. «Калі народ не разумее ўрад, то трэба мяняць народ», — пажартаваў хтосьці з вялікіх. А што, у гэтым ёсць слушнасць. Толькі мяняць не шляхам перамяшчэння з родных у месцы не вельмі аддаленыя.

Сяргей ШАЎЦОЎ.





Сяргей Юркевіч з горада Бяроза ўсё прывык рабіць сваімі рукамі, да ўсяго даходзіць сваім розумам. Так было і з яго захапленнем разьбой па дрэву. Ніхто не вучыў яго тонкасцям гэтай справы. Проста адчуў такое жаданне — пачаў чытаць кнігі, сам вырабіў неабходны інструмент.

Зразумець, адчуць матэрыял дапамагла прыродная назіральнасць. Для майстра корань ці нараст на дрэве — прадмет творчага вывучэння. Умее ён убачыць у мудрагелістых малюнках і зломах задумку прыроды, якую трэба крыху падправіць, каб праявіліся раптам рысы чалавечага твару, каб зайграў сваімі формамі незвычайны падсвечнік. А яшчэ выразае майстар з дрэва птушак — лёгкіх, ажурных, здольных, здаецца, узляцець у неба.

НА ЗДЫМКАХ: рэзчык па дрэву Сяргей ЮРКЕВІЧ і адна з яго работ — «Казачнік».

Фота Яўгена КАЗЮЛІ. (БЕЛІНФАРМ).

ПАЛЕМІЧНЫ КЛУБ «ЗВЯЗДЫ»

Генерал Езавітаў: здраднік ці агент КДБ?

Імя Канстанціна Барысавіча Езавітава сучаснаму чытачу ні аб чым не гаворыць. Людзі старэйшага пакалення, што перажылі вайну, маглі сёе-тое чуць пра яго як беларускага буржуазнага нацыяналіста, хаўрусніка гітлераўцаў. Ён упамінаўся ў пасляваенных публікацыях беларускіх гісторыкаў і журналістаў у адной абойме з прэзідэнтам Беларускай Цэнтральнай Рады Астроўскім, а таксама Кушалем, Ермачэнкам, Казлоўскім, Іваноўскім, Акінчыцам, Адамовічам, Шкеленкам, Ганько і іншымі актыўнымі памагатымі нямецка-фашысцкіх акупантаў і саўдзельнікамі іх злачынстваў у Беларусі ў 1941—1944 гадах.

Хто ж ён: здраднік Радзімы ці агент КДБ (такая версія таксама існуе)? Адказ на гэтае пытанне даць цяжка, але вось што сведчаць матэрыялы крымінальнай справы № 1939/1207, якая захоўваецца ў архіве КДБ Рэспублікі Беларусь.

К. Езавітаў нарадзіўся 5 лістапада 1893 года ў горадзе Дзвінску Віцебскай губерні (цяпер Даўгаўпілс, Латвія) у сям'і прафесіянальнага расійскага афіцэра-беларуса. Да рэвалюцыі скончыў Віцебскі педагагічны інстытут, а потым 4-месячны паскораны курс Паўлаўскага ваеннага вучылішча па першаму разраду ў Петраградзе.

Пасля заканчэння вучылішча атрымаў званне малодшага афіцэра, добраахвотна пайшоў на фронт і ваяваў у саставе 151-га пяхотнага Пяцігорскага палка Паўночнага фронта, дзе і сустрэў лютаўскую рэвалюцыю.

У лістападзе 1917 года К. Езавітаў узведзены ў паручнікі і ад салдат і афіцэраў — беларусаў дэлегаваны на з'езд ваеннаслужачых-беларусаў Паўночнага фронта, які адбыўся ў Віцебску 15—22 лістапада. Тут яго выбралі таварышам (намеснікам) старшыні з'езда, увялі ў састаў выканкома Беларускай цэнтральнай вайсковай Рады (створана ў жніўні 1917 года) у якасці таварыша (намесніка) старшыні выканкома Рады.

У снежні 1917 года К. Езавітаў удзельнічаў у рабоце Першага ўсебеларускага кангрэса ў Мінску. Выканкомам Рады кангрэса быў выбраны Народным сакратаром па ваенных справах. У лютым 1918 года быў узведзены ў капітаны, потым у падпалкоўнікі, з'яўляўся камендантам Мінска і начальнікам беларускага гарнізона горада. Ён прымаў актыўны ўдзел у фарміраванні беларускіх ваенных часцей для барацьбы з мясцовай Савецкай уладай, за стварэнне незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі (абвешчана ў перыяд нямецкай акупацыі Мінска 25 сакавіка 1918 г. — **А. Х.**). Пасля выгнання немцаў з Беларусі К. Езавітаў эвакуіраваўся спачатку ў Гродна, дзе стаў камандзірам беларускага нацыянальнага палка ў саставе Літоўскай арміі, а потым у Коўна. У 1920—1921 гадах ён з'яўляўся шэфам беларускай ваенна-дыпламатычнай місіі ў Эстоніі і Латвіі. «За выдатную працу на карысць Беларускай Народнай Рэспублікі, выпаўненую ім за граніцай», К. Езавітаву было прысвоена званне генерал-маёра.

У 1921 годзе К. Езавітаў прыняў латвійскае падданства, застаўся ў Рызе, стварыў беларускае культурна-асветніцкае таварыства «Бацькаўшчына», якое кіравала пытаннямі арганізацыі беларускіх школ і падрыхтоўкі кадраў настаўнікаў для іх.

З пачатку Вялікай Айчыннай вайны і да чэрвеня 1944 года К. Езавітаў жыў у Рызе, займаўся аднаўленнем у Латвіі беларускіх школ (былі адноўлены 4 школы і дзве гімназіі). Вось што ён напісаў пра гэты перыяд сваёй дзейнасці ў аўтабіяграфіі 20 лістапада 1944 г.: «У 1941 г., калі Беларусь была вызвалена нямецкай арміяй ад бальшавікоў, я прапанаваў тагачаснаму кіраўніцтву беларускай работы ў Мінску, доктару Івану Ермачэнку, свае паслугі ў якасці арганізатара беларускай ваеннай школы...».

Сапраўды, у Мінск у 1942 годзе яго двойчы выклікаў доктар Ермачэнка, які ўзначальваў «Беларускую народную самадапамогу». Ён прапанаваў К. Езавітаву стаць загадчыкам

аддзела прапаганды «Самадапамогі». Але той адмовіўся, матывуючы гэта тым, што больш ахвотна ўзяў бы аддзел адукацыі, якім кіраваў ксёндз Радзіеўскі і які не быў зацікаўлены ў школьным развіцці і, тым больш, не былі зацікаўлены ў гэтым немцы. Аднак гэтага аддзела яму не далі і ён паехаў зноў у Рыгу.

20 чэрвеня 1944 года К. Езавітаў праз нямецкія ўстановы атрымаў паведамленне, што 25 чэрвеня 1944 г. ён абавязаны быць у Мінску на Усебеларускім кангрэсе ў якасці госця ад латвійскіх беларусаў, але без права выступлення. 2-гі Усебеларускі кангрэс адбыўся 27 чэрвеня 1944 года ў памяшканні драматычнага тэатра імя Я. Купалы, г. зн. там, дзе ў снежні 1917 года праходзіў 1-ы Усебеларускі кангрэс.

На кангрэсе прысутнічала 1.200 чалавек — прадстаўнікоў мясцовых гарадскіх і раённых упраўленняў, беларускіх нацыяналістычных арганізацый, эміграцыі. На ім з прывітальнай прамовай выступіў К. Езавітаў. Пасля выступлення ён быў выбраны ў прэзідыум кангрэса і старшынёй рэдакцыйнай камісіі, а таксама членам БЦР.

29 чэрвеня 1944 года ў сувязі з набліжэннем Чырвонай Арміі да Мінска Беларуская Цэнтральная Рада эвакуіравалася спачатку ў Кёнігсберг, а потым у Берлін. Езавітаў вярнуўся ў Рыгу. Але 1 жніўня 1944 года, успамінае ён, відаць, па патрабаванню беларускіх арганізацый, немцы пасадзілі яго на параход і ў парадку «прымусовай эвакуацыі» адправілі цераз Данцыг у Берлін. Тут да сярэдзіны кастрычніка 1944 года ён ніякай спецыяльнай работы не вёў.

Пасля таго, як у кастрычніку 1944 года немцы прызналі БЦР урадам Беларусі і дазволілі ствараць некаторыя структуры, Астроўскі назначыў Езавітава начальнікам Галоўнага ваеннага ўпраўлення і зрабіў яго сваім саветнікам па ваенных пытаннях, адхіліўшы ад гэтай ролі падпалкоўніка Ф. Кушаля. К. Езавітаву было прысвоена званне генерал-маёра Беларускай краёвай абароны (БКА).

Галоўная задача ўпраўлення заключалася ў стварэнні беларускіх нацыянальных часцей. Былі ўзяты на ўлік усе беларусы, што знаходзіліся ў Германіі, арганізаваны курсы перападрыхтоўкі кадраў афіцэраў, адкрыты школы падрыхтоўкі афіцэраў і падафіцэраў, арганізаваны курсы прапагандыстаў для вярбоўкі ў беларускія нацыянальныя фарміраванні. 20 студзеня 1945 года была пачата арганізацыя беларускай штурмавой брыгады СС «Беларусь» (камандзір Ф. Кушаль), якая камплектавалася ў г. Гіршау.

Летам 1944 года немцы злілі адступіўшыя з Беларусі батальёны БКА са сваімі рэгулярнымі часцямі і накіравалі ў Францыю, на Заходні фронт супраць англійскіх і амерыканскіх войск (каля 16 тысяч чалавек). Там гэтыя часці былі разбіты, многія салдаты ўзяты ў палон. Рэшткі былі адкліканы БЦР у Берлін і накіраваны ў зноў фарміруемую штурмавую брыгаду «Беларусь». Абучэнне кадраў гэтай брыгады праводзілася па статутах нямецкай арміі пад агульным камандаваннем нямецкага падпалкоўніка Зіглінга, яго намеснікам быў назначаны беларус маёр Рагуля.

У пачатку 1945 года Езавітавым быў падрыхтаваны і выдадзены страявы Статут беларускай нацыянальнай арміі, у аснову якога былі пакладзены статуты нямецкай і польскай армій.

Зімой 1945 года галоўнае ўпраўленне войск СС у Берліне і кіраўнік так званага «Ягтфербант-Ост» палкоўнік Скарцэні (вядомы шпіён і дыверсант) прапанаваў прэзідэнту БЦР Астроўскаму, Езавітаву, Радзько (былы бургамістр Віцебска, камандзір асобнага батальёна СС «Дальвітц») сфарміраваць групы па 30 чалавек, узброіць, забяспечыць іх падрыўнымі сродкамі і закінуць у тыл Чырвонай Арміі ў раёны Памераніі і Познані для арганізацыі дыверсій, тэрору і шпіянажу. Аднак апошнія не згадзіліся з гэтай прапановай Скарцэні і прапанавалі сфарміраваць полк «Беларускай краявой абароны» колькасцю 1.000 чалавек, узброіць яго і перакінуць на самалётах у Беларусь для арганізацыі паўстанцкай дзейнасці з мэтай звяржэння Савецкай улады і вываду Беларусі з саставу СССР.

Скарцэні неахвотна згадзіўся з планам Астроўскага — Езавітава — Радзько, але папярэдзіў іх, што пасля экіпіроўкі і інструктажу падраздзяленні гэтага палка павінны пешым маршам цераз лінію фронту прабірацца на Беларусь для выканання сваіх баявых задач, таму што ў немцаў, маўляў, няма самалётаў і парашутаў для перакідвання яго туды па паветры. Але ўсе гэтыя планы неўзабаве праваліліся ў сувязі з капітуляцыяй гітлераўскай Германіі.

Ужо ў лютым 1945 года члены і кіраўнікі БЦР пачалі паступова эвакуіравацца з Берліна. Першая група на чале з Ю. Сабалеўскім 6 лютага 1945 года выехала ў г. Херстэр (Вестфалія), 8 лютага Астроўскі накіраваў другую групу членаў БЦР у г. Гіршау (Баварыя), дзе знаходзілася штурмавая брыгада СС «Беларусь».

20 сакавіка 1945 года сам прэзідэнт Астроўскі выехаў з Берліна ў г. Гіршау, а адтуль у горад Херстэр з намерам чакаць там англа-амерыканскія войскі. У Херстэр былі вывезены ўсе архівы і іншыя матэрыялы, а таксама каштоўнасці БЦР. У пачатку красавіка пры набліжэнні англа-амерыканскіх войск да Херстэра немцы вывезлі Астроўскага і членаў БЦР, што знаходзіліся з ім, у Гіршау, які неўзабаве быў заняты англа-амерыканскімі войскамі. І Астроўскі са сваімі саратнікамі перайшоў на іх бок. Астатніх членаў БЦР, што засталіся ў Берліне, немцы накіравалі ў Цюрынгію. Езавітаў з імі не мог паехаць, таму што ў гэты час быў хворы і ляжаў у шпіталі пад Берлінам.

У канцы красавіка 1945 года ён быў арыштаваны супрацоўнікамі ўпраўлення контрразведкі «Смерш» 1-га Украінскага фронту, потым этапіраваны ў Маскву, а адтуль у кастрычніку — лістападзе 1945 года пераведзены ў Мінск. Ён памёр у турэмнай бальніцы ў Мінску 23 мая 1946 года ад туберкулёзу лёгкіх.

У заключэнне трэба сказаць яшчэ пра адну раней невядомую старонку біяграфіі К. Езавітава. Як вынікае з пратакола допыту ад 26 красавіка 1945 года, К. Езавітаў паказаў, што з 1925 па 1934 год супрацоўнічаў з савецкімі паўпрэдамі ў Латвіі Чарных і Ульянавым пад мянушкай «Озал». У 1940 годзе пад той жа мянушкай працаваў у НКДБ Латвійскай ССР. У сакавіку 1941 года яго пад выглядам «прадстаўніка прафсаюзаў» выклікалі ў Маскву. Сустрэлі (чэкісты — **А. Х.**) на вакзале і адвезлі ў гасцініцу «Масква» на 4-ы паверх. Меў размовы з работнікамі НКДБ, якія даручылі яму «звязацца з беларускай эміграцыяй і працаваць сярод яе там, таксама пастарацца заняць больш высокае становішча». З наступленнем ваенных дзеянняў, указваў далей Езавітаў, удалося звязацца з беларускай эміграцыяй у Берліне, а таксама ў Мінску.

Аляксандр ХАЦКЕВІЧ, доктар гістарычных навук, прафесар.

А ўсё ж бандыт ці герой?

16 чэрвеня «Звязда» на сваіх старонках змясціла падборку вельмі цікавых матэрыялаў, якія доктар гістарычных навук, прафесар А. Хацкевіч адшукаў у архівах КДБ Беларусі. Матэрыялы маюць дачыненне да дзейнасці беларускага генерала Станіслава Булак-Балаховіча ў 1919—1920 гг. Аўтар характарызуе генерала як «заўзятага контррэвалюцыянера, пагромшчыка і ката беларускага народа, авантурыста, які, апіраючыся на банды Барыса Савінкава, сфарміраваў на грошы буржуазна-памешчыцкай Польшчы свае «беларускае войска» і спрабаваў скінуць Савецкую ўладу на Беларусі».

Пэўная адметнасць тэрміналогіі і асаблівасці стылю (вельмі знаёмыя) дазваляюць здагадацца, што адказ на пытанне: «Хто ж такі Булак-Балаховіч — бандыт ці нацыянальны герой?» для спадара Хацкевіча даўно ўжо вядомы, а зараз ён толькі «просвещает» чытача ды і пацвярджае сваю тэзу аб «атамане пагромшчыкаў» спасылкамі на **«ўспаміны** аднаго з вядомых дзеячаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, шэфа ваенна-дыпламатычнай місіі Беларускай Народнай Рэспублікі ў Латвіі і Эстоніі ў 1919—1920 гадах палкоўніка К. Б. Езавітава, які добра ведаў Булак-Балаховіча і дапамагаў яму ў фарміраванні «беларускай арміі», а затым парваў з ім».

Хочацца заўважыць, што характарыстыка Езавітава вытрымана зусім у іншым стылі, чым характарыстыка Булак-Балаховіча. Трэба думаць, што такая ўзнёслая ацэнка дзейнасці Кастуся Езавітава даецца аўтарам публікацыі часова, пакуль з ведамства, якому падпарадкаваны гэтыя цікавыя архівы, не прагучала каманда «даць ход» адпаведна афармленаму «кампрамату» цяпер ужо на самога Езавітава. А з'яўленне такога роду матэрыялаў у друку— справа часу. Там іх павінна быць дастаткова: можна мець пэўнасць—неўзабаве дачакаемся новых публікацыяў з гэтага серыяла.

Яшчэ адна дэталь: прафесар Хацкевіч, на жаль, не робіць спасылак на выданне, у якім былі змешчаны «ўспаміны» К. Б. Езавітава, але, прымаючы пад увагу, што жанр твора самім аўтарам азначаны як «публікацыя па матэрыялах КДБ РБ», а таксама зважаючы на інфармацыю ў газеце «7 дней» пад тытулам «Найдено в архивах КГБ» (нумар за 18—24 траўня 1992 г.), можна здагадацца, што гэтыя «ўспаміны» К. Б. Езавітаў (тады ўжо былы генерал дывізіі, якая падчас другой сусветнай вайны змагалася супраць бальшавікоў на баку Нямеччыны, а ў канцы вайны паддалася ўзброеным сілам саюзнікаў), рабіў незадоўга да смерці ў Менскім следчым ізалятары НКУС, куды пасля арышту ён быў перададзены на просьбу Цанавы.

І хаця «7 дней» інфармуюць, што дзеля ўтрымання пры жыцці цяжка хворага К. Езавітава для яго апошнімі днямі перад смерцю нкусаўцамі быў прызначаны «генеральскі паёк», можна быць упэўненым, што абстаноўка сталінска-берыеўскай вязніцы, мякка кажучы, спецыфічным чынам усё ж такі паўплывала на змест інфармацыі, якую падручныя Цанавы атрымалі ад генерала дывізіі «Беларусь».

Але калі нават усе «ўспаміны» К. Езавітава ў дачыненні да С. Булак-Балаховіча—чыстая праўда, дык гэтая праўда—няпоўная. Бо, акрамя архіваў КДБ РБ, існуюць, як вядома, і архівы ЦК КПСС. І так здарылася, што прэс-сакратар прэзідэнта Расіі Павел Вашчанаў, палітычны аглядальнік «Комсомольской правды», займеў магчымасць (пасля правалу жнівеньскага путчу) азнаёміцца з гэтымі архівамі і 2 кастрычніка 1991 г. у сваёй газеце апублікаваў артыкул пад назваю «Краіна Заветаў», з якога вынікае, што не толькі папярэднікі КДБ РБ цікавіліся справамі Станіслава Булак-Балаховіча, а за ім пільна сачыў сам правадыр сусветнага пралетарыяту... Так, калі войскі генерала змагаліся супраць бальшавікоў, абараняючы нованароджаную незалежнасць краін Балтыі, таварыш Ленін прапаноўваў «...постараться наказать Латвию и Эстляндию военным образом (например, «на плечах» Балаховича перейти где-либо границу хоть на 1 версту и повесить 100—1000 их чиновников и богачей)...».

«Под видом «зеленых» (мы потом на них все и свалим) пройдем на 10—20 верст и перевешаем кулаков, попов, помещиков. Премия 100.000 руб. за повешенного...» (канец цытаты).

Далей П. Вашчанаў так падсумоўвае свае ўражанні ад знаёмства з архівамі ЦК КПСС і стылем працы «крамлёўскага летуценніка»: «Ленинские пометки имеются на поступавших в его адрес материалах, представляющих Красную Армию в неблаговидном свете (например, участие Первой конной армии в еврейских погромах и т. п.).

Гэтая інфармацыя толькі зараз робіцца заваёвай галоснасці. Дык, можа, не так усё проста з «успамінамі» К. Езавітава?

Дык хто ж такі генерал Балаховіч: бандыт ці нацыянальны герой? Хто мае вушы, той чуе; хто мае вочы—той бачыць.

Віталь КОШАЛЕЎ.

ВАША ПІСЬМО АТРЫМАЛІ

ПАКУЛЬ УЗГАДНЯЮЦЬ, А ЖЫЦЬ ТРЭБА...

Парогі многіх службовых кабінетаў паабівала жыхарка в. Глоўчына Бялыніцкага раёна М. Кузняцова, а канкрэтнай дапамогі нідзе не дабілася. Чаго ж просіць вясковая жанчына? Здавалася б, нічога асаблівага, самага элементарнага — адрамантаваць хату, каб у ёй можна было жыць.

Вось што на скаргу, дасланую ў «Звязду», адказаў рэдакцыі старшыня Бялыніцкага райвыканкома П. Пацюпін: —

— Дом, у якім жыве аўтарка пісьма, сапраўды патрабуе бягучага рамонту, а менавіта новага фундамента і замены лагаў пад драўляную падлогу.

Па ўзгадненню з праўленнем калгаса «Наша перамога» рамонт дома будзе зроблены ў трэцім квартале сёлетняга года.

Будзем спадзявацца, што пасля ўзгадненняў тут нарэшце возьмуцца за канкрэтныя справы.

ЭХ, ДАРОЖКА ПАЛЯВАЯ!..

Не адзін вадзіцель у вясновае разводдзе нядобрым словам памінаў дарогу ад Паліцкага да Прыцерпы і, каб не забуксаваць, зварочваў на поле. З болем у душы глядзелі і мясцовыя жыхары на тое, як аўтамашыны коламі дратавалі пасевы, нішчылі травы. «Няўжо няма ніякага выйсця?— з такім пытаннем звярнуўся ў рэдакцыю Трафім Мацвеевіч Варабей з в. Прыцерпа Асіповіцкага раёна.

Чаму няма — ёсць! Гэта пацвярджаецца ў адказе **намесніка міністра будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог рэспублікі Г. ЧАПЦОВА,** які піша:

«Міністэрства будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог Рэспублікі Беларусь разгледзела дасланае пісьмо аб будаўніцтве ўчастка дарогі Паліцкае — Прыцерпа.

Устаноўлена, што ўказаная дарога знаходзіцца на балансе і абслугоўванні ДРБУ № 199 дарожна-рамонтна-будаўнічага аб'яднання «Магілёўаблдарбуд» пры Магілёўскім аблвыканкоме.

Паводле паведамлення начальніка ДРБУ № 199 т. Сазановіча І. А., работы па будаўніцтву ўчастка дарогі Паліцкае — Прыцерпа будуць пачаты ў IV квартале гэтага года з поўным завяршэннем іх у 1993 годзе».

Што ж, калі так яно і будзе, то дарога крывая і палявая сапраўды стане прамой і надзейнай.

КАЛІ ЗАЗВОНЯЦЬ ТЭЛЕФОНЫ!

Стаім у чарзе на ўстаноўку тэлефонаў ужо больш як 10 гадоў. Калі ж яны, нарэшце, з'явяцца і зазвоняць у нашых дамах? Такое пытанне было ў пісьме жыхароў вул. Гастэлы і завулка Калектыўнага г. Мазыра.

Ліст рэдакцыя накіравала ў Міністэрства сувязі і інфарматыкі рэспублікі, а адказ дасланы **начальнік Гомельскага ўпраўлення сувязі П. РАДЗЮК.** Ён, у прыватнасці, паведамляе:

— Лінейна-кабельныя збудаванні гарадской тэлефоннай сеткі ў г. Мазыры адсутнічаюць. У 1991 годзе ў сувязі з добраўпарадкаваннем вуліцы Гастэла і завулка Калектыўнага Мазырскі раённы вузел сувязі ўласнымі сіламі пачаў тут работы па тэлефанізацыі. Але з-за адсутнасці сродкаў і неабходных матэрыялаў яны былі часова спынены.

Цяпер завершаны мантаж канчатковага кабельнага ўстройства.

Паводле паведамлення начальніка Мазырскага РВС, пытанне ўстаноўкі тэлефонаў па вул. Гастэлы і зав. Калектыўнаму будзе вырашана сёлета ў III квартале ў парадку чарговасці і пры наяўнасці тэхнічнай магчымасці.

Як кажуць, застаецца чакаць і спадзявацца. Магчыма, на гэты раз не дарэмна?

ХОЧАШ ВУЧЫЦЦА — ПЛАЦІ

«Ці праўда, што трэба плаціць дзве тысячы рублёў тым, хто вучыцца на завочным аддзяленні ў ВНУ?»— —пытаецца Т. Уласава з г. Мінска.

Пытанне актуальнае, датычыцца многіх завочнікаў, і тлумачэнне **начальніка ўпраўлення ВНУ і педагагічнай адукацыі Міністэрства адукацыі рэспублікі М. ПЛЕСКАЦЭВІЧА** будзе дарэчы.

— Так,— сказана ў міністэрскай паперы,— у адпаведнасці з Законам аб адукацыі (арт. 37) і пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 1991 года № 123 «Аб мерах па развіццю дагаворных адносін у падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй (пункт 1, абзац 2) навучальныя ўстановы маюць права весці падрыхтоўку спецыялістаў па дагаворах з прадпрыемствамі, фірмамі, арганізацыямі з поўнай аплатай за навучанне неабходнай колькасці спецыялістаў як з ліку асоб, прынятых па конкурсу, так і звыш кантрольных лічбаў.

Так што, калі хочаш вучыцца і стаць спецыялістам — відаць, няхай за гэта раскашэляцца прадпрыемствы, якія накіравалі цябе павышаць кваліфікацыю.

Падрыхтаваў да друку аддзел пісьмаў «Звязды». (Тэлефон 32-04-52).

ВОЗГАДАЕ РОЗГАДАЕ

У ТУРЦЫЮ НА «МАСКВІЧЫ»

СЛОНІМ. (М. Мініч). Турэцкім грамадзянам, якія ўзводзяць тут жылы гарадок для ваеннаслужачых, падабаюцца не толькі мясцовыя дзяўчаты. У той час, калі суайчыннікі ганяюцца за замежнымі маркамі аўтамабіляў, туркі з ахвотаю купляюць легкавушкі нашай вытворчасці.

Нядаўна яшчэ адзін аўтаматар з паўднёвай краіны прыдбаў сабе «Масквіч» апошняй мадэлі за 300 тысяч рублёў.

Дзеці могуць спаць спакойна. Хоць бы ў Слуцку

СЛУЦК. Выканком гарсавета народных дэпутатаў стварыў пазабюджэтны фонд для фінансавання ведамасных дашкольных устаноў. Папаўняцца фонд будзе мэтавымі зборамі ў размеры 3,5 працэнта ад фактычнага фонду аплаты працы ва ўсіх гаспадарчаразліковых прадпрыемствах і арганізацыях Слуцка.

ЛЯТАЛЬНЫ АПАРАТ, КРЫЙ НАС АД ЛЯТАЛЬНАГА ЗЫХОДУ...

Мірнае жыццё жыхароў Кобрына вельмі ўскладняе закрыты ваенны гарадок, дзе дыслацыруюцца ваенныя лётчыкі. Тэрыторыя аэрадрома плошчай звыш 452 гектараў уклініваецца ў жылы мікрараён, дзе звыш 19 тысяч жыхароў.

Пры ўзлёце і пасадцы верталётаў і рэактыўных самалётаў узровень шуму ў некалькі разоў перавышае дапушчальныя нормы. Палёты ажыццяўляюцца над усёй тэрыторыяй горада, што выклікае абгрунтаваныя абурэнне і трывогу гараджан. Неаднаразова здараліся і катастрофы — на шчасце, пакуль што за межамі горада.

Аб усім гэтым было паведамлена ў трывожным лісце за подпісам старшыні Кобрынскага гарадскога Савета народных дэпутатаў М. Гардзіевіча на імя вышэйшых асоб рэспублікі, у якім адначасова змяшчалася просьба аб вывадзе часці з горада. І вось нядаўна з Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь быў атрыманы адказ, у якім, у прыватнасці, сказана: «...Пытанне аб перабазіраванні авіяцыйных часцей на іншыя аэрадромы не разглядалася ў сувязі з тым, што Міністэрствам абароны СНД не прынята рашэнне аб вывадзе авіяцыйных часцей, уключаных у састаў ВПС СНД, на тэрыторыю Расіі.

Вырашаецца пытанне аб зніжэнні колькасці лятальных апаратаў на аэрадроме Кобрын... Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь цяпер не мае неабходных сродкаў для паскарэння вырашэння гэтага пытання».

Такім чынам, авіяцыйныя маторы над Кобрынам будуць раўсці па-ранейшаму.

Рыгор ПАЛЯШУК. (БелаПАН).

ТАРЫ-БАРЫ— НЯМА ТАРЫ

У рэспубліцы ўслед за бензінавым голадам катастрафічна стаў адчувацца недахват тары, з-за якога прыёмныя пункты шклатары амаль прастойваюць, а бутэльку з-пад шампанскага ці з-пад піва немагчыма здаць.

І выйсця пакуль што няма. Скрынак пад посуд у Беларусі ніхто не робіць, а тыя, што былі завезены з іншых рэспублік, паступова растраваюцца ў магазінах і на складах.

Праўда, здаецца хутка такое напружанне спадзе. Бутэльку з-пад шампанскага збіраецца выпускаць Гродзенскі шклозавод, пасля чаго, будзем спадзявацца, зноў запрацуе на ўсю моц Мінскі завод шампанскіх він, які цяпер задыхаецца без бутэлек, а выпуск скрынак рознага «калібру» ўзяўся асвойваць завод у Буда-Кашалёве.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

РАДЫЁ ПЕРАХВАТ

РАДЫЁ «СВАБОДА»

● Тысячы паўднёвакарэйскіх студэнтаў правялі ў Сеуле марш у падтрымку патрабаванняў аб аб'яднанні дзвюх карэйскіх дзяржаў. Студэнты таксама патрабавалі вываду з Паўднёвай Карэі амерыканскіх войск, вызвалення палітычных зняволеных.

● Вярхоўны Савет Арменіі сабраўся ўчора на надзвычайную сесію, скліканую прэзідэнтам рэспублікі Лявонам Тэр-Петрасянам. Парламент разгледзіць магчымасць правядзення рэферэндума ад недаверы прэзідэнту. Удзельнікі нядаўніх апазіцыйных мітынгаў у Ерэване патрабавалі адстаўкі Тэр-Петрасяна. Сам прэзідэнт адвяргае гэтыя патрабаванні. Мітынгуючыя патрабуюць таксама прызнання незалежнасці Нагорна-Карабахскай рэспублікі, а Тэр-Петрасян лічыць, што гэта мера толькі справакуе Азербайджан.

● Кіраўнікі ўрадаў Літвы, Латвіі, Эстоніі, а таксама пяці скандынаўскіх краін прымаюць удзел у неафіцыйнай сустрэчы, якая пачалася ў Даніі. На дзвюхдзённай нарадзе будуць абмеркаваны праблемы капіталаўкладанняў скандынаўскіх краін у эканоміку Прыбалтыкі. Кіраўнікі ўрадаў разгледзяць перспектывы міжнародных адносін і, магчыма, пытанне аб вывадзе расійскіх войск з Прыбалтыкі.

«У еўрапейскую паездку запрашаюць і з дысбата»

Што такое дысбат, ведаюць, напэўна, многія. У ваенных— гэта «пераменны састаў», «вайсковая часць за калючым дротам». А ў тых, хто там быў і правёў «лепшыя» гады сваёй маладосці, акрамя службы ў арміі, дысцыплінарны батальён асацыіруецца з «зонай», «салдацкай турмой» і звычайнымі казармамі, вакол якіх па ўсяму перыметру стаяць вышкі з вартавымі, кантрольна-следавая паласа, за перасячэнне якой атрымаеш кулю ў спіну, і аўчаркі.

Праўда, перад звычайнымі «зэкамі» дысбатчыкі маюць перавагу: адбыўшы тэрмін, ні ў адзін дакумент не заносіцца запіс аб судзімасці, на якую потым касавурацца кадравікі. І ўсё ж — гэта зона, дзе ўсе вокны з кратамі і ўсюды на бетонных плітах, якія раздзяляюць тэрыторыю дысбата, папераджальны надпіс: «Стой, страляюць!» Усюды трэба хадзіць строем, а за варотамі КПП — яшчэ і пад канвоем. Раз у месяц пасылка з абмежаваным асартыментам прадуктаў і рэчаў і адна сустрэча з роднымі і блізкімі — чатыры гадзіны.

Наогул, свабоды тут не хапае катастрафічна. Але ж гэта не зона адпачынку. Гэта проста «зона», салдацкая «зона».

Асобы дысцыплінарны батальён, які «прапісаўся» ў Мінску адразу пасля вайны, стаў месцам «ссылкі» салдат аж з пяці ваенных акруг былых Узброеных Сіл СССР. Акрамя ваеннаслужачых Беларускай ваеннай акругі, вароты яго заўсёды трымаліся адчыненымі для Групы савецкіх войск у Германіі, Маскоўскай ваеннай акругі ПВА і войск цэнтральнага падпарадкавання, а таксама для асуджаных з Прыбалтыкі.

Таму колькасць «жадаючых» працягнуць службу яшчэ на 2—3 гады тут заўсёды перавышала тысячу. Праўда, у сувязі з дэмакратызацыяй нашага грамадства кантынгент зменшыўся амаль у тры разы. І цяпер тут адбываюць пакаранне крыху больш за 400 чалавек.

Дарэчы, Мінскі дысбат увесь час займаў лідзіруючае месца сярод іншых дысцыплінарных батальёнаў СССР. Яму не шкодзіла б даць званне гвардзейскага...

Жарт, вядома, хоць у кожным жарце ёсць доля праўды...

КПП

Як тэатр пачынаецца з вешалкі, так любая вайсковая часць — з кантрольна-прапускнога пункта. Але гэты КПП трохі не такі, як звычайны армейскі: цэнтральны праход, раздзяляюць вялікія краты, за якімі пільна сочыць дзяжурны афіцэр з трыма салдатамі.

Дарэчы, КПП — двухпавярховы будынак. Будаваў яго сам камандзір АДБ— палкоўнік Вячаслаў Бортнік.

АСУДЖАНЫЯ

Гэтае слова адразу выклікае асацыяцыю з астрыжанымі «пад нуль» мужыкамі ў паласатай адзежы і з бліскучымі фіксамі. Але тут такіх няма. Простая салдацкая хэбэшная форма з зялёнымі пагонамі. Стрыжка, «каб сусед не змог за валасы рукамі ўхапіць» (так яе назваў Бортнік).

З 431 чалавека пераважная большасць салдат трапіла сюды з-за таго, што не пашанцавала трохі ў службе. Адзін разбіў машыну з начальствам, другі — краў дошкі на будоўлі, трэцяга папрасілі прыхаваць аўтамат. Пераважная меншасць — за мардабой.

Пасля таго, як міне палавіна тэрміну, камандаванне часці можа хадайнічаць перад ваенным трыбуналам аб умоўнадатэрміновым вызваленні.

98 працэнтаў асуджаных такім чынам і выходзяць адсюль. Кожны, хто трапіў сюды, жыве надзеяй, што пройдзе палавіна тэрміну, а там —дамоў. Таму што накіроўваюць даслужваць да канца толькі рэдкіх «экземпляраў», якіх, як кажуць, толькі магіла выправіць. Але такіх — няшмат.

Дарэчы, мінскі дысбат — гэта унікальная вайсковая часць. У той час, як у многія ваенныя акругі ідзе цэнтралізаваны набор моладзі «на месцах», тут у поўным сэнсе слова — інтэрнацыяналізм.

«Няўдачнікі» больш як трыццаці нацыянальнасцей: рускія, украінцы, беларусы, лезгіны, цыганы. Але ж месца тут хапае ўсім. Праўда, асноўны фон усё ж славянскі. Таму адаптацыя «іншаземцаў» праходзіць без ускладненняў. Ад свініны ніхто не адмаўляецца. Але да дысбатаўскага ладу жыцця прывыкаюць усе парознаму.

Казарма для асуджаных напомніла мне райскі куточак, дзе так ціха і ўтульна, што з цяжкасцю верылася: можа, гэта дэкарацыя?

Высокая пабеленая столь, чыста вымытая падлога з шырокім мяккім дываном на цэнтральным праходзе і маленькімі — па баках. Інтэр'ер нядаўна дапаўнялі карціны «мясцовых» умельцаў на сценах, партрэт з усмешкай Ільіча, а таксама каляровы тэлевізар з распарадкам яго работы.

Калі б сюды яшчэ драўляныя ложкі... Але і металічныя двух'ярусныя пакідаюць прыемнае ўражанне: строга адбіты канцік на коўдры, узбітая падушка. І толькі краты на вокнах і пры ўваходзе ў казарму напамінаюць, што тут жыве 4-я рота пераменнага саставу. Асуджаныя, значыць. У калідоры— дакументацыя дзяжурнага па роце, лісты нарадаў, і... сатырычная газета.

Любяць дзяўчат прыгожых
Нашы бравыя рабяты
У еўрапейскую паездку
Запрашаюць і з дысбата.
Гумар тут, відаць, не знік.

«Я плакала, не магла паверыць, што такое магло здарыцца з маім сынам. І цяпер прашу вас, хлопцы: ваш лёс залежыць ад вас. Зрабіце ўсё, каб хутчэй быць дома.

Вас там чакаюць. Калі б вы ведалі, як вас не хапае».

Гэта радкі з пісьма маці аднаго асуджанага. Ліст гэты знайшоў сваё месца на стэндзе адной з рот дысбатаўцаў.

Не ведаю, мабыць, ён прымусіць кагосьці пусціць слязу, успомніўшы родную маці. Ды дысбат, асабліва мінскі, па словах салдат «пераменнага саставу», — «гэта шчасце перад зонай. Тут можна жыць».

Тут не анёлы. Але ж бяда яднае ўсіх. І трапіць у яе можа кожны. Хоць спярша не верыцца. Таму «праяснене» наступае толькі тады, калі ты ўбачыш, як за табой пільна сочыць аўтаматчык з вышкі, ці настаўляе зброю ў спіну твой аднагодак з роты аховы, якому, дарэчы, не пазайздросціш. Ну і служба — скажа ён.

РОТА АХОВЫ. СЯРЖАНТЫ

Гэта салдаты пастаяннага саставу. Яны тут служаць свае два гады, несучы пільна дзень у дзень вартавую службу.

Першых на жаргоннай мове дысбата асуджаныя называюць па-рознаму: «паляўнічыя», «пастухі». Ёсць, канешне, і больш «крутыя» азначэнні. Але іх «пры людзях» тыя, каго ахоўваюць, стараюцца не ўжываць. Сяржантаў мова «зоны» называе «шнэкамі». Чаму менавіта «шнэкі», а не шліцы, напрыклад, ці падшыпнікі? Ніхто толкам не ведае. Але прыгожае слова. І да сяржанцкага саставу яно, відаць, прыліпла, як жалеза да магніта.

«Шнэкі» жывуць з асуджанымі ў адной казарме. Ходзяць без аўтаматаў і штык-нажоў. Непасрэдна маюць сувязі з усімі асуджанымі «тэт-а-тэт».

Да службы ніхто з іх не працаваў ні ў дзіцячых садах, ні ў ляслах. Многія марылі скакаць з парашутам, насіць форму марскога пехацінца ці пагранічніка. Але ж... тут таксама трэба камусьці служыць.

ГАЎПТВАХТА

У дзень нашага наведвання яе пастаяльцамі былі два казахі і адзін масквіч. Апошні «касец», г. зн. той, хто «косіць» пад шызафрэніка, ідыёта.

Горш за ўсё тут — стаяць без работы. 50 хвілін вучыш Статут, 10 хвілін адпачываеш. І так — суткамі. Здурэць можна. Але амаль усе стойка і мужна пераносяць гэтыя пакуты. Заслужыў — атрымаў. Ды яшчэ кормяць па салдацкай норме, калі не на строгім рэжыме.

Ад гаўптвахты нікто яшчэ не паміраў.

СТАЛОВАЯ

Гэта, бадай, адзінае месца, куды з ахвотай ходзяць і асуджаныя, і пастаянны састаў. Харчуюцца яны з аднаго катла. Розніца толькі ў тым, што «пастухі» і «шнэкі» ядуць на гадзіну раней за сваіх аднагодкаў-«пераменшчыкаў», якія тут у «афіцыянтах», і ў нарадзе на кухні. Для сяржантаў і камандыры аховы — асобная зала для харчавання. Хоць і дэмакратыя ў дысбаце, ды ўсюды ўбачыш нейкае раздзяленне. Але ж такі парадак.

САБАЧНІК

Тут ёсць свае Шарыкі і Бобікі. 14 магутных аўчарак павінна быць у адпаведнасці са штатам. І ўсе — у наяўнасці. Амаль усе яны навучаны браць след.

Сабака Анар, напрыклад, больш прывык да дула аўтамата, чым да аб'ектыва фотаапарата. Таму глядзіць у яго насцярожана і бурчыць, напамінаючы нам, што яму хутка на дзяжурства, на якое заступае палавіна аўчарак. Іншыя сем сабак прыйдуць на варту толькі праз 12 гадзін.

КАМАНДЗІР

Вячаслаў Бортнік тут камандзірам даўно. Хутка будзе дзесяць гадоў, як дысбат стаў месцам яго службы. Па яго расказах, калі ён толькі прыйшоў сюды служыць, гарэлка тут з-за плота ракой цякла. На тэрыторыі нярэдка можна было ўбачыць п'янага салдата пастаяннага саставу. Ці нават асуджанага.

Калі стаў камандзірам, а гэта апошнія некалькі гадоў, адмяніў усе лішнія пастраенні, зборы, нарады. «Новая мятла» замяла па-новаму. І жыццё паказалася і яму, і ўсім астатнім не такім ужо і маркотным.

Праўда, у свае «каля сарака» ён выглядае на гадоў 10 старэйшым. Што толькі служба не зробіць з чалавекам! Круглыя суткі — з думкамі аб тым, што-дзе дастаць ці «выбіць». «Даеш дваіх салдат — будуць трубы». Па такому прынцыпу праходзіць часцей за ўсё «бартэр» з кіраўніцтвам прадпрыемстваў. Прыходзіцца круціцца.

Справаздачамі аб зробленай рабоце не захапляецца. Лішнюю медальку за выслужлівасць атрымаць не імкнецца.

Яго крэда: «Дрэнных салдат не бывае — ёсць дрэнныя камандзіры». За сваю службу нікога не пасадзіў, але строга прытрымліваецца прынцыпу: лепш аднаго пасадзіць цяпер, чым дзесяць праз месяц, праз два — сто, а праз тры месяцы — «сценка» на сценку.

Ужо змяркалася, калі мы развітваліся. У душы застаўся нейкі жаль. Але адразу ўспомніліся словы Бортніка. «Тут сядзяць не анёлкі». Тут амаль усе тыя, якіх у звычайных войсках 5—6 чалавек. Але ўсе яны людзі, у якіх ёсць надзеі, асабістае «я» і маці.

На змярканні шэрыя вышкі з вартавымі здаліся нейкім грузам, які ўвесь час на цябе ціснe. Погляд зноў прайшоўся па кантрольна-следавой паласе, затрымаўся на калючым дроце. Дысбат рыхтаваўся да адбою.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Патрабаванне часу—згода!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

нях аналізу палітычнай сітуацыі ў рэспубліцы, дзеянняў цяперашніх уладных структур, будуць прапаноўвацца свае варыянты рэформ. Вось і ў першым нумары ідзе вялікі артыкул дырэктара эканамічнага цэнтра «Экон» Доўгеля «Выйсце з крызісу ёсць», артыкул старшыні ПНЗ Г. Карпенкі «Згода — патрабаванне часу», у якім даецца сваё бачанне форм і зместу ўзгодненага ўзаемадзеяння розных сацыяльных слаёў і палітычных сіл у час, калі рэформы, на думку кіраўніцтва ПНЗ, у рэспубліцы не распрацаваны, не прадуманы і таму праводзяцца хаатычна.

Вельмі прыемна, што з самага пачатку газета ўзялася за асвятленне гісторыі нашага краю, «белых плям», якіх яшчэ так багата. Кастусь Езавітаў. Імя гэтага дзеяча БНР, першага беларускага генерала, мала вядома шырокаму колу чытачоў. Матэрыялы па яго справе толькі што рассакрэціла КДБ. Сёння «Згода» публікуе ўспаміны К. Езавітава аб Першым Усебеларускім кангрэсе, які адбыўся ў Мінску ў снежні 1917 года і ў рабоце якога ён удзельнічаў. Гэты артыкул напісаны ў 1944 годзе, раней не друкаваўся і ў час арышту аўтара быў канфіскаваны супрацоўнікамі савецкай контрразведкі «Смерш». Публікацыя павінна зацікавіць не толькі спецыялістаў-гісторыкаў.

Уражаннямі аб перспектывах беларуска - польскага супрацоўніцтва дзеліцца пасол РБ у Польшчы У. Сянько.

У святле маючага адбыцца рэферэндуму важнае месца набывае Закон аб выбарах, вакол якога яшчэ разгараецца спрэчкі, бо менавіта ад яго залежыць, якой якасці і дзеяздольнасці вышэйшы орган улады мы атрымаем. Ініцыятыўная група ПНЗ пад кіраўніцтвам Віктара Ганчара распрацавала свой закон аб выбарах. Аб гэтым таксама можна даведацца з газеты. Жыццё іншых партый і рухаў — БНФ, аграрна - дэмакратычнай, Усебеларускага Славянскага сабора, ХДЗ — таксама ёсць на старонках выдання. Так што па першым нумары можна смела меркаваць — чыста палітычную газету мы ўжо маем. Выходзіць яна будзе, пачынаючы з верасня, раз на тыдзень на васьмі палосах, на беларускай і рускай мовах.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

Гэтыя брэсцкія дзеці (НА ЗДЫМКУ) зарабляюць сабе на марожанае самі. Кожную пятніцу з'яўляюцца яны ў рэдакцыі новай гарадской газеты «Вечерний Брест», каб, узяўшы пачак свежых экземпляраў, разнесці іх па горадзе. «Вячорка» раскупляецца за лічаныя гадзіны. Такая форма супрацоўніцтва аказалася выгаднай і рэдакцыі, і юным распаўсюджвальнікам газеты. Папулярнасць, а з ёю—і тыраж «Вечернего Бреста» рэзка ўзраслі, а школьнікі за сваю працу з кожнага прададзенага экземпляра атрымліваюць 45 капеек.

Фота Эдуарда КАБЯКА. (БЕЛІНФАРМ).

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

ЧАС ВЫБІРАЦЬ

«Час ідзе, і прыходзіць пара выбіраць. Да 1 кастрычніка краінам СНД прыйдзецца прыняць палітычнае рашэнне аб знаходжанні ў рублёвай зоне», — заявіў міністр знешнеэканамічных сувязей Расіі. Беларусь вырашыць уводзіць талеры, або яна страціць адну з адзнак суверэннай дзяржавы — права на крэдытна-грашовую эмісію, якая добраахвотна будзе аддадзена ў рукі другой дзяржавы?

З ЭКАНАМІСТАЎ— У БІЗНЕСМЕНЫ

Сёлета ў рэспубліцы з'явілася новая навучальная ўстанова — Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносін. МІПСА будзе рыхтаваць эканамістаў і сацыёлагаў, а ў далейшым плануецца наладзіць выпуск высокакласных спецыялістаў у галіне бізнесу. Навучанне ў Міжнародным інстытуце платнае. Адзін курс завочнага аддзялення каштуе 8 тысяч рублёў, вячэрняга—14 тысяч рублёў.

ЧЫМ ВІНАВАТЫЯ МАГІЛЫ!

У Крыме апаганена магіла пісьменніка Аляксандра Грына. Збітымі і скінутымі на зямлю знайшлі служыцелі могілак частку надмагільнага помніка, які ўвасабляў Асоль, — мраморную калону. Расколатай аказалася і пліта з ініцыяламі жонкі пісьменніка.

ЗА РАДКОМ ДЗЯРЖКАМСТАТА

Аб выкідах шкодных рэчываў у атмасфернае паветра прадпрыемствамі Рэспублікі Беларусь

У першым паўгоддзі г. г. прадпрыемствамі рэспублікі выкінута ў атмасфернае паветра 472 тыс. тон шкодных рэчываў, што на 142 тыс. тон, або на 23 працэнты менш, чым было выкінута за аналагічны перыяд 1991 года.

Зніжэнне водпуску цеплавой і электрычнай энергіі спажыўцам, а таксама павелічэнне долі прыроднага газу, які спальваецца ў якасці паліва, садзейнічала прадпрыемствам Мінэнерга зменшыць выкіды шкодных рэчываў у атмасферу на 81 тыс. тон, або на 32 працэнты.

У сувязі з нестабільнай работай і прыпыненнем асобных вытворчасцей, знізіліся выкіды шкодных рэчываў на прадпрыемствах Дзяржкампрома на 36 тыс. тон, або на 20 працэнтаў.

Разам з тым 271 прадпрыемства, або 22 працэнты іх агульнай колькасці, павялічыла выкіды шкодных рэчываў у атмасферу ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года на 10 тыс. тон, або на 24 працэнты. Больш, чым у першым паўгоддзі 1991 года, выкінулі шкодных рэчываў Полацкі камбінат будаўнічых матэрыялаў, Обальскі керамічны завод, вытворчае аб'яднанне «Азот», Светлагорскі завод «Карммаш», Крупскае і Нясвіжскае лінейныя вытворчыя ўпраўленні магістральных газаправодаў і іншыя.

Сярод гарадоў рэспублікі найбольшую колькасць шкодных рэчываў выкінута прадпрыемствамі Наваполацка — 65 тыс. тон, або 14 працэнтаў ад валавога выкіду па рэспубліцы, Мінска — 48 тыс. тон (10 працэнтаў), Магілёва — 38 тыс. тон (8 працэнтаў), Бабруйска — 23 тыс. тон (5 працэнтаў), Віцебска — 16 тыс. тон (3,4 працэнта), Гродна — 14 тыс. тон (2,9 працэнта).

З агульнай колькасці выкінутых у атмасфернае паветра шкодных рэчываў 425 тыс. тон, або 90 працэнтаў, склалі газападобныя і вадкія, 47 тыс. тон (10 працэнтаў) — цвёрдыя рэчывы.

Як відаць з вышэйсказанага, скарачэнне выкідаў шкодных рэчываў у І паўгоддзі 1992 года адбылося, у асноўным, за кошт эканамічных фактараў, а не ў сувязі з правядзеннем прыродаахоўных мерапрыемстваў.

Дзяржкамстат Рэспублікі Беларусь.

Аб аплаце працы работнікаў у Рэспубліцы Беларусь

Сярэднемесячная заработная плата рабочых і служачых у першым паўгоддзі 1992 года склала 2.590 рублёў і ўзрасла ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ў 7,4 раза. У чэрвені яна дасягнула 4.319 рублёў і павялічылася за паўгоддзе ў 4 разы. Рознічныя цэны на тавары і паслугі за гэты перыяд узраслі ў 5,5 раза.

Ніжэй прыводзяцца даныя аб аплаце працы работнікаў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый асобных галін народнай гаспадаркі:

	Сярэднямесячная заработная плата работнікаў, рублёў		У прац. да адпаведнага перыяду 1991 г.	
	у студзені — чэрвені 1992 г.	у чэрвені 1992 г.	студзень — чэрвень 1992 г.	чэрвень 1992 г.
Рабочыя і служачыя народнай гаспадаркі	2.590	4.319	738	917
у тым ліку па прадпрыемствах, установах, арганізацыях:				
прамысловасці	2.930	4.593	801	959
саўгасаў	1.862	3.261	644	877
транспарту	2.942	4.804	751	903
сувязі	2.414	4.155	736	966
будаўніцтва	3.224	5.612	752	937
гандлю і грамадскага харчавання	1.848	2.909	655	797
жыллёва-камунальнай гаспадаркі і бытавога абслугоўвання насельніцтва	2.224	3.775	739	822
аховы здароўя, фізкультуры і сацыяльнага забеспячэння	2.026	3.257	673	783
народнай адукацыі	2.198	3.715	685	787
культуры	1.877	3.495	678	1075
мастацтва	1.872	3.200	494	650
навукі і навуковага абслугоўвання	1.973	3.530	518	740
крэдытавання і дзяржаўнага страхавання	3.660	6.975	698	886
апарату органаў кіравання	2.846	4.858	703	1.034
Калгаснікі	1.629	2.721	572	743

Сярэднямесячная заработная плата рабочых і служачых Расіі ў першым паўгоддзі г.г. склала 3.021 рубель, у тым ліку ў чэрвені —5.067 рублёў, Казахстана —2.063 рублі і 3.599 рублёў, Латвіі — 2.835 і 4.675 рублёў. У Літве заработная плата рабочых і служачых у чэрвені склала 5.768 рублёў.

Дзяржкамстат Рэспублікі Беларусь.

ЦІ ДОЎГА ЗАЙЧЫКУ ГУЛЯЦЬ?

Неразумныя метады гаспадарання на Беларусі ў апошнія 20—30 гадоў прывялі да значнага скарачэння шэрагу відаў жывёл. Асабліва адчувальным біяіндыкатарам на ўжываемыя ў сельскай гаспадарцы ядахімікаты і ўгнаенні аказаўся заяц-русак.

Калі, па няпоўных даных, у 80-х гадах у Францыі штогод адстрэльвалі ў сярэднім больш за 3 мільёны зайцоў, у Чэхаславакіі — 1 млн. 350 тысяч, у Польшчы — да 1 мільёна, дык па ўсёй Еўрапейскай частцы былога СССР — толькі 800 тысяч, з іх у Беларусі — 80 тысяч.

І адбылося так не таму, што паляўнічыя ў нас горшыя. Проста зайцоў, на Беларусі стала значна менш, чым у заходніх суседзяў.

Калі так і надалей пойдзе, дык убачым мы нашых зайчыкаў толькі на разліковых білетах Нацыянальнага банка.

Віктар ЯЎЛАНАЎ.

interfax ИНТЕРФАКС

НАРОДНЫ ФРОНТ АЗЕРБАЙДЖАНА БЯРЭ ПАД КАНТРОЛЬ ВЫПЕЧКУ ХЛЕБА

Выканком Народнага фронта Азербайджана накіраваў сваіх прадстаўнікоў на хлебазаводы рэспублікі для ажыццяўлення грамадскага кантролю над вытворчасцю хлеба. Гэтае рашэнне прынята ў адпаведнасці са статутам гэтай арганізацыі, у адным з артыкулаў якога замацавана права грамадскага кантролю над прадпрыемствамі рэспублікі.

Гэтая мера, гаворыцца ў рашэнні выканкома НФА, прадыктавана неаднаразовымі выпадкамі сабатажу на хлебабулачнай вытворчасці ў апошні час. У прыватнасці, у буйных гарадах рэспублікі, у тым ліку ў Баку і Гянджы, апошнімі днямі пачалі з'яўляцца доўгія чэргі за хлебам. У рашэнні выканкома Народнага фронта Азербайджана адзначаецца, што аб'ектыўнай перадумовай для спекуляцыі хлебам і з'яў сабатажу з'яўляецца розніца паміж высокімі цэнамі на збожжа і муку і нізкімі—на хлебабулачныя вырабы. Трэба таксама адзначыць, што цана на стандартную булку ў Азербайджане вагаецца ад 2 руб. 20 кап. да 3 руб. у дзяржаўных магазінах.

(«ІНТЭРФАКС»).

ДУМКА ЮРЫСТА: КАНСТЫТУЦЫЙНЫ СУД НЕ МАЕ ПРАВА РАЗГЛЯДАЦЬ ЗВАРОТ БЫЛЫХ КАМУНІСТАЎ

Член праўлення ўкраінскага юрыдычнага фонду Віктар Ніказакаў лічыць, што Канстытуцыйны суд не можа прыняць да разгляду зварот былых камуністаў аб праверцы канстытуцыйнасці ўказа прэзідэнта Краўчука аб забароне камуністычнай партыі Украіны.

В. Ніказакаў адзначыў, што ў адпаведнасці з законам аб Канстытуцыйным судзе, ён можа разглядаць заявы толькі вышэйшых службовых асоб пачынаючы з прэзідэнта і заканчваючы калектыўнымі зваротамі адной пятай дэпутацкага корпуса Вярхоўнага Савета.

(«ІНТЭРФАКС»).

ПУНКТ ПОГЛЯДУ

«Што не здзейснілася па-мастацку, тое не здзейснілася наогул»

З вялікай няміласці да нас гісторыі на працягу дзесяцігоддзяў гінулі па турмах і лагерах ці разбрыдаліся па свеце лепшыя носьбіты духоўнага скарбу — людзі-творцы. Парушылася тая культурная атмасфера, якою дыхалі беларусы (хай сабе час ад часу і не на поўныя грудзі). Утварыўся цэнасны вакуум, амаль поўнае духоўнае здранцвенне нацыі. І пакуль памяркоўны, цярплівы беларус разважае аб хлебе надзённым (не вельмі глыбока ўсведамляючы, што ён беларус), яго дзеці ўзрастаюць у беспаветры каменнымі гасцямі на сваёй зямлі. Пры такім становішчы абудзіць духоўны патэнцыял нацыі можа толькі жыватворная сіла мастацтва.

Відаць, ніхто не стане аспрэчваць, што ступень адукацыі, вучонасць чалавека не гарантуюць наяўнасці ў ім высокай маральнай і культурнай змястоўнасці. Сфарміраваны па тэхнакратычнай сістэме мыслення інтэлект надае асобе прыкметы робата. Мастацтва ж узбагачае чалавека, дапамагае дасягнуць духоўнай сталасці, нараджае дабрыню, спагаду, самаахвярнасць, імкненне да справядлівасці.

У адрозненне ад большасці цывілізаваных грамадстваў нашае заціжная хварэе на недаацэнку ролі эстэтычнай асветы ў станаўленні свядомай асобы. На жаль, дзяржаўныя структуры, закліканыя «будаваць» чалавека ведамі, спаўна не ўсведамляюць неадкладнай неабходнасці ўключэння мастацтва ў кантэкст адукацыі. Таму і расклад школьных заняткаў, і нават вучэбныя планы педагагічных інстытутаў у пераліку дысцыплін амаль што не маюць прадметаў па мастацтву і культуры, пазбаўляючы тым самым школьную моладзь і будучых настаўнікаў магчымасці набыць эстэтычны багаж. Дробныя зярняты выпадковага спасціжэння студэнтам мастацтва ў тэатры, музеі, канцэртнай зале не могуць даць буйных парасткаў духоўнай дасканаласці, таму што кідаюцца яны ў непадрыхтаваную да пасеву глебу.

Традыцыйна складзены навучальны працэс у педагагічных інстытутах скіраваны на вузка прафесійныя веды. Негуманітарныя ж навучальныя ўстановы ў сваіх праграмах наогул не знаходзяць месца для прадметаў па мастацтву, эстэтыцы, культуры. У выніку панавання тэхнакратычнай накіраванасці адукацыі мы атрымліваем замест «усебакова развітай асобы» ўзор безаблічнага, з абмежаваным «спецпрадметамі» светапоглядам, «сфінкса». І надалей выпускнік навучальнай установы (калі гэта асоба не адораная) застаецца на ранейшым узроўні свайго эстэтычнага развіцця, не маючы аніякай патрэбы яго пашыраць, нават і не здагадваючыся аб такой неабходнасці. А калі праз пяць гадоў маладому спецыялісту пашанцуе прайсці перападрыхтоўку, то чарговы этап набыцця ведаў, пабудаваны толькі на прафесійных дысцыплінах, нічым не ўзбагачае яго духоўна-мастацкі кругагляд.

Бясспрэчна, што галоўнай адукацыйнай структурай грамадства, дзе закладваюцца асновы яго інтэлектуальнай будучыні, з'яўляецца школа. Менавіта тут пачынаецца актыўнае фарміраванне светапогляду юнага грамадзяніна, насычэнне яго розуму ведамі, а душы — пачуццямі (сацыяльнымі ў тым ліку). Роля настаўніка ў гэтым працэсе — неацэнная. Але «дзякуючы» павярхоўным (пакрыху аб усім) ведам, якія набыты ў агульнай плыні амаль усенароднай вышэйшай адукацыі, настаўнік не здольны выканаць свайго прызначэння прафесійна, у глыбінным сэнсе словаспалучэння «педагог-прафесіянал». Таму што занадта бракуе яму таго самага мастацка-эстэтычнага бачання свету. Духоўнасць выхоўваецца духоўнасцю. І наадварот.

Некалі прэстыжная прафесія педагога спакваля страціла сваё першаснае прызначэнне «гуманю мыслить научить». Хто сёння ідзе ў настаўнікі? У асноўным сялянская моладзь, выхаваная на растаптаным матэрыяльным побыце і духоўным заняпадзе беларускай вёскі. Па якіх крытэрыях вядзецца прыём у педінстытуты? Па той жа старой сістэме добра здадзеных экзаменаў па так званых «прадметах». А як жа з асобай, з яе духоўным светам? Па-ранейшаму недаравальна безуважнымі застаюцца творчы патэнцыял, узровень культуры абітурыента. Зразумела, па «патэнцыялу» і «ўзроўню» нельга здаць экзамен, як нельга і прыняць яго, напрыклад, па ўнутранаму святлу чалавека. Гэта можна адчуць, гэтым можна прасякнуцца, калі сам экзаменатар уяўляе сабой інтэлектуальную, з творчым светаўспрыманнем асобу. Паўторымся, што такія здольнасці ў большасці нашых педагогаў не развіты.

І цягнецца гэты бясконцы ржавы ланцуг абмежаванай духоўнасці, перарваць які магчыма праз агульнае наша ўсведамленне значнасці эстэтычна-мастацкага напаўнення адукацыі.

Пошук такой вось «арыяднінай ніткі» ў няпростым лабірынце выхаваўчага працэсу складае сэнс і змест некалькіх мэтавых праграм Беларускага інстытута праблем культуры. «Пуцяводнымі» ў сферы ўласна мастацкай арыентацыі ўяўляюцца праграмы «Дзяржаўная падтрымка мастацка адоранай моладзі» і «Адраджэнне старажытнай музыкі Беларусі».

У свеце набыты карысны вопыт збяражэння і стымулявання развіцця адоранай моладзі. Ёсць адзінкавыя прыклады мецэнацтва з боку грамадства і ў былым СССР, але трывалых заканадаўчых сувязей паміж дзяржавай і таленавітай асобай не было. І калі суверэнная Беларусь хоча мець сваю будучыню на ўзроўні цывілізаваных краін, ёй трэба паклапаціцца аб здольнай да творчасці моладзі.

Вынікам нашага даследавання стане методыка пошуку і дыферэнцыяцыі таленавітых дзяцей на вопыце замежжа, будзе распрацавана мадэль грамадска-дзяржаўнай падтрымкі адоранай моладзі. Што дазволіць прыпыніць яе адток з Беларусі.

Стратэгічнай задачай другой праграмы «Адраджэнне старажытнай музыкі Беларусі» з'яўляецца вяртанне народу помнікаў яго музычнай культуры XVII—XIX стагоддзяў. Часовым творчым калектывам даследчыкаў распрацаваны механізм пошуку і распаўсюджвання нотных тэкстаў, разлічаны на два гады. Але дзякуючы ўвішнасці аматараў знойдзены, расшыфраваны і ўжо ў гэтым годзе загучаць у канцэртных залах многія творы мінуўшчыны. Праграма як звяно асветніцкай дзейнасці падрыхтуе глебу для развіцця нацыянальна своеасаблівых форм музычнай адукацыі. Праз нашых слухачоў, выкладчыкаў, праз прафесійных выканаўцаў будзе працаваць на духоўны свет асобы.

Але вастрыня праблемы, звязанай з выпрацоўкай нацыянальнай сістэмы эстэтычнага выхавання і ўкаранення яе звенняў па розных вектарах адукацыйна-выхаваўчага працэсу, не можа быць знята намаганнямі аднаго або некалькіх інстытутаў. Таму дадзены артыкул мае за мэту засяродзіць увагу міністэрстваў адукацыі і культуры, Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, і не толькі іх.

Ва універсітэтах сярэднявечча падрыхтоўчыя факультэты мелі назву «артыстычныя» і адпавядалі ёй у сэнсе стылю навучання. А вуэбныя дысцыпліны старадаўняй школы (так званыя «Сем вольных мастацтваў») уключалі рыторыку і музыку. Павернемся ж розумам да гэтага вопыту і перанясём яго ў нашыя навучальныя ўстановы. Усвядомім творчае крэда Дастаеўскага, словы якога вынесены ў загаловак.

У. СКАРАХОДАЎ,
рэктар Беларускага інстытута праблем культуры, кандыдат філасофскіх навук.

Знешне вельмі марудліва, Георгій ДЗІНІН пераўвасабляецца, калі бярэ ў рукі скрыпку ці віяланчэль. Быццам добры доктар, знаходзіць ён балючыя месцы ў музычным інструменце, каб потым вярнуць гуку чысціню і звонкасць.

У Георгія, як кажуць, талент ад Бога. На Захадзе ён мог бы стаць вельмі багатым чалавекам. Для гэтага ёсць і ўсе ўмовы. Яго бацька — пан Польд, былы савецкі ваеннапалонны, цяпер паважаны чалавек у германскім горадзе Гютэрсла. Ён кансультуе вядомыя фірмы па пытаннях бізнесу. Таму Георгій мае магчымасць бываць у Германіі. Там ён таксама настройвае інструменты, але за чыста сімвалічную плату. А потым зноў вяртаецца ў родны Мінск, каб працягваць любімую справу.

Фота Аляксандра ТАЛОЧКІ. (БЕЛІНФАРМ).

Прывіды сыходзяць у падземку. Каб застацца там назаўсёды

Як вы думаеце, што здараецца з чалавекам, які аднойчы зразумеў, што трывалая глеба пад нагамі — не болей, чым метафара, а ўвесь прыгожы, пабліскваючы сваімі гранямі свет, прывабны і загадкавы, як піраміда Хеопса, — усяго толькі гульня ўласнага ўяўлення?

Не, калі ён разумны чалавек, то не дойдзе да стадыі самагубства, але і не будзе імкнуцца ўсё ператварыць на гарманічны лад і змагацца за справядлівасць. Самае разумнае, што ён зробіць, паслізнуўшыся на ўсіх гранях свайго пірамідальнага лёсу, — паспрабуе трымацца на самай вяршыні, знойдзе вялікую кропку, адзін недарэчны рух убок з якой можа ператварыць жывога ў асколкі.

Чалавек, якога часта можна бачыць у падземных пераходах, лічыць, што яшчэ трымаецца. А пунктам адліку для яго новага жыцця стаў той дзень, калі ён упершыню апынуўся на вуліцы. Не ўмеючы размаўляць з людзьмі, няшчасце якіх здалёк бачна па зацертай шапцы або скрынцы на прыступках. Наогул цяжка сустрэцца вачыма з чалавекам, які ўжо фізічна не можа працаваць сам на сябе. Але не лёс і не жыццё, напэўна, зрабіла яго інвалідам. Проста аднойчы ён вырашыў, што паколькі значна адрозніваецца фігурай і магчымасцю рухацца ад астатняй, большай масы чалавекападобных істот, дык трэба свой гэты недахоп ператварыць у выйгрыш. Бачыў — робяць гэта іншыя, чаму б самому не паспрабаваць? Але ўтрымлівала думка пра тое, што потым, калі атрымаеш гэтыя грошы і вернешся ў свой ўласны цьмяны свет, ці не здарыцца так, што зачыніцца апошні вентылятар, які даносіць свежае паветра адтуль, дзе цябе ўжо фактычна выкраслілі. Дзесьці, у нейкіх паперках ён яшчэ праходзіць, але гэты ўлік хутчэй нагадвае адзнаку аб мёртвай душы. І то кажучы, ці за жывога столькі даюць.

Не ведаю, як спытаць пра яго былое жыццё, пра сваякоў, якія, магчыма, недзе ёсць. Ды і навошта, здаецца, ён у сваёй свядомасці ўжо выкрасліў тыя дні. Гаворыць толькі пра тое, што ёсць цяпер.

— Дык вось... Вуліца ёсць вуліца. Тут ты заўсёды сірата. Калі я толькі выйшаў, не ведаючы, што гэта такое ўвогуле, спачатку здалося — трапіў да прывідаў на пагулянку. Па натуры я нясмелы чалавек і, каб прыжыцца і ўладкавацца, давялося абысці многа месц. Спачатку шугалі адусюль. Асабліва, калі па сталоўках падбіраў недаедзенае і запіваў недапітым. Быў момант, калі нават вельмі галодны быў, але да такой ежы яшчэ не прывык, выварочвала ўсё назад, як толькі выходзіў на вуліцу. Цёткі, што там сталы выціраюць, спрабавалі выштурхнуць, калі я доўга затрымліваўся, пляваліся, гледзячы на мяне. А што рабіць, калі адной рукой нават лыжкай хутка арудаваць не можаш. Але я прыходзіў туды і сядзеў ціха ў куточку, потым мая персона перастала рэзаць вока, настолькі прывыклі да маіх з'яўленняў, што нават перасталі заўважаць. У забягалаўках са «стаячымі» столікамі я ўвогуле зліўся поўнасцю з інтэр'ерам. Быццам бы ножка ад стала або пляма на сцяне. Здаралася, што тыя цёткі з анучамі збіралі хлеб і мне падносілі — усё роўна выкідваць. Вас цікавіць, што ў душы адбываецца, калі ўсё гэта паспытаў? А нічога! Напэўна, мая душа памерла значна раней, а цяпер сядзіць недзе там, на небе, глядзіць на мяне і ківае галавой: вось як яно... Магчыма, ёй не падабаецца тое, што я раблю. А можа, наадварот, толькі яна мяне і разумее — мая ўсё ж такі. А каб яна мяне не пакінула зусім, можа, яшчэ сядзеў бы сіднем і баяўся пераступіць так званую «мяжу чалавечай годнасці». Ды хопіць ужо, усё гэта толькі словы. Ніякай такой мяжы ўвогуле няма. Калі табе трэба, ты пойдзеш і будзеш прасіць. Таму што ёсць тыя, хто можа даць.

Памятаеце, стварыў некалі Гюго свайго Квазімода. Чалавек, аблічча якога ўсіх пужала, мог весяліць публіку. Гэтым жыў, таму што не ведаў нічога іншага. Чым жудаснейшай была грымаса на яго твары, тым большы заробак. Але тады, як сцвярджае Гюго, пэўная катэгорыя людзей рабіла свой бізнес на пачварстве іншых...

Гэты «Квазімода» працуе на сябе. Так, гаворыць ён, жабракі бываюць розныя — багатыя і бедныя. Наўрад ці за спінамі гніючых старых нехта стаіць, хто кіруе жабрацкім «бізнесам», а для некаторых жабрацтва ўжо ператварылася ў прафесію. Напэўна, маладая, здаровая, грудастая жанчына з дзіцем на руках выклікае ў некага жаль. А ўсё ж такі, здаецца, для здароўя і будучыні дзіцяці, тым больш немаўляці, было б больш карысна паляжаць ціхенька ў калысцы, чым душыцца пылам змрочных пераходаў.

Яго Усявышні пакуль міласцівы ад спатканняў з прафесіяналамі. Такія сустрэчы, кажуць, не вельмі прыемныя. Тым больш, што «Квазімода» (так можна яго называць) не імкнецца ўзбагаціцца за чужы кошт. Грошы — яны што вада, між пальцаў цякуць.

Ён яшчэ не навучыўся, як трэба «прасіць». Паспрабаваў у людныя месцы сунуцца, а там ужо і так адзін у аднаго на галаве сядзяць. Стаяў неяк у ціхім раёне — міліцыя прывязалася, не спадабаўся ім.

— Раз блукаў між двароў. Увечары ўжо, а там сабак вывелі прагульвацца. Жудасныя істоты! Вельмі фанабэрыстыя, відаць, таму, што кормяцца намнога лепш за мяне. А сілы колькі! Адзін як чорт, чорны, з бліскучымі вачыма кінуўся —вядома, такія, як я, у іхнім доме не жывуць. Усхапіўся, пабег! Адна нага і так была кульгавая, а тут такую хуткасць развіў — свет не бачыў. Зараз зусім цяжка хадзіць. Але ўцёк. Уяўляю, як гэта смешна. Калі спыніўся і прытуліўся да сцяны — аддыхацца — заўважыў дзяцей, якія назіралі за маімі ўцёкамі. Падышлі, пачалі разглядваць, усміхаюцца. Няхай, у кіно такога наўрад ці ўбачаць. Зусім малышня, ім жа хочацца пагуляць. Свае лялькі, напэўна, ужо без рук і ног валяюцца, а тут жывая лялька, яшчэ адна рука ёсць і паўтары нагі. Падысці пабаяліся, дасталі доўгую палку і пхнулі ў бок. Гуляць дык гуляць: адмахнуўся і скрывіў усмешку. Засмяяліся, відаць, спадабалася. Адна дзяўчынка чіхенька так, сціпла спытала: «Дзядзечка, а чаму ты такі брыдкі?». Эх, ты, маленькая...

Нечакана ўсё знікла і ператварылася ў вогненны сцяг, які ахутаў галаву, вочы, заляпіў вусны. Па плячах заскрыгатаў пясок, скаціўшыся, нібыта халодны град улетку. Вось якія ў іх забавы — пяском кідаюцца ў бомжаў. Сціхлі, нікога не чуваць. А цяпер што адказаць? Відаць, твар зноў адлюстраваў скамечаныя пачуцці, бо там, за гэтым агідным сцягам, зноў захіхікалі. І вырашылі працягваць гульню.

Таму што цяпер ужо не сцяг, а вялікая цяжкая сякера мільганула перад вачыма... Гэта быў усяго толькі камень, але, відаць, трапіў у самы цэнтр мішэні. Галава набракла, вадкае цяпло прыліпла да пальцаў. Дзеці спужаліся, збеглі.

Трэба было неяк абцерці кроў, якая ўжо загусцела на валасах. Рука знайшла ў траве некалькі буйных лістоў. Дзе б яшчэ вады ўзяць, абмыць?

Цікавае слова — «абмыць». Неяк зараз недарэчна гучыць. Абмываюць, звычайна, нябожчыкаў. Хіба я не мярцвяк? Пасмяяліся — не страшна, абгадзілі — нічога, пабілі — не баліць. Жывыя такіх адносін не дарююць.

З няўдала абматанай галавой «Квазімода» зноў зрабіў грымасу.

А ён гаворыць, што зараз прыжыўся. Вуліца не даруе крыўдаў, з ёю трэба навучыцца жыць у згодзе. Яму тут нават весела. За дзень нагледзішся столькі цікавых сцэн — ні тэатр, ні кіно не спатрэбяцца. Увогуле, вуліца — гэта страшная сіла, і калі яе поўнасцю адчуеш, то не захочаш крыўдзіцца на свой лёс і на людзей, якія жывуць інакш за цябе. Хай сабе. Інваліды таксама ёсць багатыя і бедныя. А Усявышні ўсіх прыбярэ.

— Гавораць некаторыя — трэба змагацца. Ставяць рэкорды сярод інвалідаў, спецыяльныя спаборніцтвы — вось, глядзіце, сіла духу. Не хачу так змагацца. Таму што гэта значыць — сапраўды прызнаць, што ты не такі, як усе. А калі адзін здолею прайсці лабірынты горада — гэта будзе самы красамоўны доказ, што я мацнейшы.

А ўвогуле аб сэнсе жыцця «Квазімода» не думае. Ён скрыты недзе ў фундаменце піраміды існавання гэтага чалавека. Самая ж высокая кропка, што ён выбраў, вельмі далёкая ад падножжа, на якім упэўнена стаім мы.

Ларыса ЦІМОШЫК.

РАДЫЁ

20 жніўня

10.15 — для дзяцей. Т. Мушынская «Гісторыя пра Пеціка, які мядзведзянём быў». 11.00 — «Ваша думка, ваша прапанова». 11.30 — «Перакананць сябе». Пра шкоду п'янства. 12.00 — «Апоўдні». 13.00 — «У абедзенны перапынак». 14.00 — эстрадная праграма. 15.15 — «Нашы славутыя землякі». 16.05 — «Рамантыкі». 16.50 — «Музычныя хвілінкі». 17.00 — «Эканамічны дзённік». 17.40 — «Ад нашага ўласнага карэспандэнта». 18.00 перадачы абласнога радыё. 19.00 — гуманітарна - інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». 19.45 — «Дзень нашага жыцця». 20.05 — вячэрняя казка. 20.25 — М. Філіповіч. «Мадонна з Выселкаў». Інсцэніраванае апавяданне. 21.00 — «Ад шчырага сэрца». Музычная праграма. 22.00 — «Клопат». Медыцынскі веснік. 22.10 — «Беларусь і свет». Міжнародная праграма. 23.10 — канцэрт. 0.00 — «Начны канал».

НА ДВОР'Е

19 жніўня

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца пераменная воблачнасць, па паўночнаму ўсходу — кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ў Віцебску — 18—20, Магілёве — 19 — 21, Гродна — 20—22, Гомелі і Мінску — 21—23, Брэсце — 22—24 градусы цяпла. У наступныя двое сутак у асноўным без ападкаў, толькі ўдзень 21 жніўня па захаду рэспублікі невялікія дажджы. Тэмпература паветра ўначы — 8—13, удзень— 20—25 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ — СЁННЯ Ў НУМАРЫ

«Люстэрка». Інфармацыйная панарама.

«Браджэнне жніўня». Погляд на падзеі мінулага года.

«Беларусь здзейснілася як еўрапейская дзяржава». Актуальнае інтэрв'ю Станіслава Шушкевіча радыё «Свабода». Погляд на праблему. **«Хто загадае: «Сезам, адчыніся»?**

«Быццам бы і ёсць, але па сутнасці няма». Аб справах гандлёвых.

«Чытач — чытачу». Падборка пісьмаў.

«Зубр, лось і бабёр выходзяць на сцежку эмісіі». Паведамляем падрабязнасці.

Дзяржкамстат інфармуе — аб выкідах шкодных рэчываў у атмасфернае паветра і аб дзейнасці сумесных прадпрыемстваў.

«Зялёная аптэка». Падборка.

«Прафесія — жабрак». Жыццё, як яно ёсць.

Рэклама, аб'явы.

ПРАДАЮ ШЧАНЯТ

рускага харта і шчанят дога з дакументамі.

Мінскі тэл. 42-22-53.

ВАШ САД І АГАРОД

Матэрыялы выпуску падрыхтаваў да друку Мікалай ЧАХОЎСКІ (тэл. 32-41-92).

Ці трэба «купаць» часнок?

Гэта пытанне, якое задаў адзін з нашых чытачоў, зусім невыпадковае. Перад ужываннем мы ўсё мыем: яблыкі, грушы, слівы, бульбу, агуркі, памідоры, зеляніну... Гэта мера неабходная, бо разам з зямлёй, рознымі хімікатамі, якімі апрацоўвалі расліны ў час вегетацыі, трапляюць да нас зусім непажаданыя мікраарганізмы. Яны могуць выклікаць нават інфекцыі.

Але часнок і цыбулю не трэба прапускаць праз лазню. Вялікага эфекту мы не набудзем (змываем толькі зямлю), а шкоду нанясём абавязкова. Вільгаць трапіць унутр «сямейкі», дзе шчыльна прыціснутыя сядзяць долькі. Гарантыі, што тая вільгаць чыстая, бы сляза, ніякай. Наадварот, разам з ёю трапляюць унутр розныя ўзбуджальнікі хвароб, асабліва гнілі. У беларускіх агароднікаў бытуе нават такое правіла-павер'е: выбраў цыбулю ды часнок у сонечнае яснае надвор'е, будзеш з далікатэснай прадукцыяй да новага ўраджаю.

Так што ўстрымайцеся ад мыцця прадукцыі. Пасля тыдня сушкі на цёплым і праветраным гарышчы часнок сам «скіне» бруд. Першая лустачка-лісцік адстане. Усю цыбуліну злёгку пацёрці ў руках—і часночына стане бялютнай, бы маладзіца пад вянцом.

Найбольш важна ў час копкі не кідаць галоўкі, залішне рэзка іх не перавальваць з адной пасудзіны ў другую. Усё пабітае пры захоўванні абавязкова пусціць слязінку. А гэта—прамы шлях да псавання каштоўнай прадукцыі.

Сказанае вышэй у поўнай меры тычыцца і цыбулі. «Слабае месца» у яе—шыйка. Менавіта праз гэты вузел пранікаюць розныя ўзбуджальнікі хвароб. Ды і сама яна найбольш хварэе, што прыводзіць да загнівання ўсёй цыбуліны. А як часта разразаючы гаркаватую асобіну, заўважаем унутраныя пачарненні і гнілі! Гэта таксама вынік неахайных адносін.

Самае важнае цяпер—добра прасушыць усё: і часнок і цыбулю. Асцерагайцеся начных пахаладанняў, росаў. Яны не нашы саюзнікі А з надыходам больш працяглых халадоў, цыбулю павесіць у косах ці мяшках-сетках бліжэй да цяпла—можна нават на печы ці ля батарэі. Там цыбуліны дойдуць да кандыцыі і не будуць нам дакучаць. Часнок захоўваць у больш халодных месцах, але сухіх.

Што можна падкормліваць?

Гэта пытанне, як і першае, прадыктавана, самім жыццём. Кожны ж хоча атрымаць найлепшую прадукцыю.

Тое, што ўбіраем праз два-тры тыдні, карміць не трэба. Карысці будзе мала. Расліны проста не паспеюць «ператравіць» ежу. Але шмат што падсілкаваць абавязкова. Гэта вельмі важна для культур, якія захавалі вясёлы зялёны конус—капусту, буракі, 15-дзённы кроп, зімовую рэдзьку, асеннюю радыску, агуркі, моркву, кабачкі, гарбузы, нават фасолю.

Вельмі добра ў якасці падкормкі даць настой каравяку (1:10) з дабаўленнем лыжкі азотных угнаенняў і настой попелу—шклянка на вядро.

Усё лета агароднікі імкнуліся стварыць для раслін камфорт. Асаблівыя клопаты былі з палівамі. Яны і цяпер павінны папярэднічаць падкормкам, бо без дастатковай колькасці вільгаці нашы намаганні могуць прынесці нават шкоду: расліны пачнуць назапашваць нітраты.

Возьмем, напрыклад, буракі—цукровыя ў тым ліку. Яны ды яшчэ морква найбольш выносяць карысных рэчываў. Патрэбна пастаянна трымаць лісце ў «баявым стане»: зялёным, дастаткова развітым, без балячак. Гэта культура «пабудавана» так, што менавіта з лісця ідзе найбольшы прыток сілкавання ў корань. Таму абрывайце ліст з асцярогай (яго даюць на корм свіням і курам). Ні ў якім разе не агаляйце караняплоды.

На пясчаніках гэтай культуры часта не хапае магнію. Падыдзе калі-магнезія. Гэты элемент быццам «салодзіць» плады. А яшчэ своечасова праводзьце санітарную апрацоўку—знімайце пажоўклы і «захварэлы» ліст.

Пара саджанцаў

Пачатак вучобы школьнікаў звязаны з «садовым бумам» на базарах. З гадамі там болей і болей дрэў і рознага кустоўя. Але ж і патрэбнасці ў іх непамерна растуць! Сёння кожны дачнік і селянін марыць мець ля дома ці дачы «ўсё самае лепшае».

Час, які застаўся да масавага паходу за пасадачным матэрыялам, выкарыстайце для азнаямлення з саргамі. У знаёмых, суседзяў, сваякоў. Толькі «пакаштаваўшы па зуб», бярыцеся за кашалёк. Улічвайце, што расліны бываюць на карлікавых, паўкарлікавых і, скажам так, нармальных прышчэпах. Першыя два рана пачынаюць даваць аддачу — на другі год пасля пасадкі. Але іх і трэба больш. І глебу пад імі ўтрымліваць у вельмі дбайным стане. Высакарослыя такіх «капрызаў» не ведаюць.

Набываць саджанцы яблынь і груш лепш двухгадовымі. У іх яскрава відаць крона (некалькі галінак і праваднік), добрая мочкавая каранёвая сістэма. Кожнае дрэўца павінна быць з этыкеткай, якая служыць да пяці гадоў. На памяць не спадзявайцеся, бо абавязкова ўсё пераблытаеце, нават калі купіце два дрэўцы.

Корні лепш за ўсё загарнуць у мокрую вільготную анучку і зверху пакрыць цэлафанам. Усё лісце абарваць — яно будзе аддаваць у паветра вільгаць.

На дачы ці ля дома апусціце карані саджанцаў на некалькі гадзін у ваду. Пасля прыкапайце ў не вельмі сонечным месцы, добра паліце. Да дрэўцаў не павінна паступаць дажджавая і паводкавая вада. Прыміце меры да адпуджвання розных шкоднікаў — асабліва тых, якія «кусаюцца».

Можна дрэўцы і пасадзіць. Але абавязкова рыхтаваць пасадачныя ямы. Дыяметр іх павінен быць метр і больш, глыбіня ў залежнасці ад глебы — ад 0,6 да 1 метра. Свежы гной у ямы не закідваць, бо карані могуць падпрэць. Лепш для гэтых мэт падыдзе кампост, які добра выспеў. Мэтазгодна ўносіць упнаенні паслойна — арганічныя і мінеральныя. З гадамі расліна «знаходзіць» усё новыя і новыя карысныя гарызонты, бы свае месцанараджэнні «золата».

Пасля завяршэння ўсіх работ, саджанцы добра паліць — да двух вёдзер вады пад кожны.

Назапашваем насенне

Жнівень і верасень — месяцы, калі не толькі збіраецца ўраджай, але і нарыхтоўваецца насенне для будучага.

Сама нетрывала мацуецца да маці кроп. Ледзь толькі пабурэў — і ляціць долу. Таму яго «шапкі-парасончыкі» зразаюць як толькі насенне мяняе афарбоўку. Звяжыце ў снапкі — і ў цёплы куток на даспяванне. Звычайна праз тыдзень малоцім. Прыкладна гэтак жа нарыхтоўваем пятрушку і сельдэрэй.

Моркву вяжуць у снапкі, калі ўвесь кружок набыў цёмную афарбоўку, увагнуўся. Даспяваюць яе да трох тыдняў і абмалочваюць.

Буракі трымаюцца даволі стойка. Іх своечасова паліваць. Можна адшчыкнуць верхавінкі парасткаў-галінак, якія ўсыпаны насеннем. Яны выспяваюць дрэнна. Найлепш збіраць насенне з сярэдзіны пабегаў. Там яно буйное, добра налітае.

Асобная размова пра агуркі і памідоры. Цяпер у кожным двары сеюць і садзяць да пяці сартоў! Таму «чыстае» насенне атрымаць проста немагчыма. Гэта будзе абавязкова нейкі гібрыд — і «тое», і не «зусім».

Знімаць памідоры на насенне як мага пазней (добра пачырванелі) з першай ці другой гронкі. Даспяваюць у цёплым месцы. Калі плод стане мяккім — разрэзаць на некалькі долек і разам з сокам лыжкай сабраць у шклянку. Да трох дзён трымаць для бражэння. «Купаць» у некалькіх водах. Пасля адкінуць на цэлефан ці талерку і сушыць да сыпучасці. Захоўваць у марлечках.

Агуркі знімаць яшчэ пазней. Яны становяцца мяккімі і з цёмна-карычневай афарбоўкай. Разрэзаць на дзве часткі. Зноў выбраць у шклянку (талерачку) зярняткі разам з сокам. Настойваць і «купаць», як і памідоры. Калівы сушыць пры пакаёвай тэмпературы. Захоўваць у мяшочках ці пакетах з паперы. Абавязкова запісаць назву сорту (хоць гэта будзе нешта другое), год нарыхтоўкі.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

19 жніўня

Беларускае тэлебачанне

16.35. «Казка пра Камара Камаровіча», «Плошча кардонных гадзіннікаў», «Пра Ксюшу і камп'юшу», «Кубік». Мультфільмы.
17.30. Для школьнікаў. «ПІК» у гасцях у Ядвігі Паплаўскай.
18.00. Дак. фільмы.
19.00. Абласныя навіны (Гомель).
19.10. «Пяць зорак». Тэлегульня.
20.05. «Мае сэрца і думкі з вамі...» Да 80-годдзя пісьменніка Варыса Мікуліча.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Белая костка». Маст. фільм.
23.05. НІКа.
23.20. Музычнае мастацтва Украіны. Танцуе народны артыст Украіны Мікалай Прадчанка.

Канал «Астанкіна»

8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. «Казка пра храбрага зайца». Мультфільм.
10.00. Брэйн-рынг.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Непрадбачаныя візіты» Маст. фільм. 2-я серыя.
12.35. «Жыла-была птушачка», «Пра павучка, з якім ніхто не сябраваў». Мультфільмы.
13.10. Тэлемікст.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Сёння і тады.
14.55. «Беноні і Роза». Маст. фільм. 6-я серыя.
15.55. «Вецер у запас». Мультфільм.
16.10. Рок-урок.
17.00. Навіны.
17.25. «Куды ляціш, Віктар?» Мультфільм.
17.45. Студыя «Палітыка» паказвае: банкі.
18.15. «Багатыя таксама плачуць».
19.00. Тэма.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.50. «Непрадбачаныя візіты». Маст. фільм. 3-я серыя.
22.05. «Ялта-92». Дзень 2-гі.
1.05. «Беноні і Роза». Маст. фільм. 6-я серыя.

Канал «Расія»

11.10. «Жонка пакінула». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.15. Мульці-пульці.
15.25. «Роздум вакол конкурсу».
16.00. Хрысціянская праграма. «Нагорная пропаведзь. Блажэнныя чыстыя сэрцам».
16.30. Там-там навіны.
16.45. У гэты час праз год.
17.05. Палітаддзел.
17.45. М-трэст.
18.00. «У пошуках сябе».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «ЗША — СССР: вялікая гульня» (Францыя — Іспанія). Фільм 6-ы «Сонца ўзыходзіць на Усходзе».
20.30. «Ой вы, гусі...» Маст. фільм.
22.00. Весткі.
22.20. «Выстрал «Аўроры», ці Расійскія метамарфозы».
22.25. Ордэн Арла — узнагарода Расіі.

20 жніўня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Столькі пачуцця ў напеве родным». Фільм-канцэрт.
9.15. «Амерыканская трагедыя». Маст. фільм. 3-я серыя.
10.30. Літаратурная гасцёўня. Ю. Свірка «Між вогненных чэрвеняў».
16.30. Навіны.
16.35. «Прыгоды капітана Урунгеля». Мультфільм. 1—5-я серыі.
17.25. «Мы спяваем казку». Дзіцячая музычная школа № 15 г. Мінска.
18.00. Дак. фільмы.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. Як пачаць уласную справу. Дыялог амерыканскіх бізнесменаў.
19.45. Горад вогненных прафесій.
20.15. Тыдзень беларускага ўрада.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Творчае маладзёжнае аб'яднанне «Крок» прадстаўляе. Дабрачынны канцэрт гуртоў «Уліс» (Мінск) і «Холі Джой» (Лондан).
22.55. НІКа.
23.10. Музычнае мастацтва Украіны. Спявае Ніна Мацвіенка.

Канал «Астанкіна»

7.50. «Дзіўнае кіцяня». Мультфільм.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. «Найда». Мультфільм.
10.05. Дак. фільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Непрадбачаныя візіты». Маст. фільм. 3-я серыя.
12.35. «Лебедзі», «Чаму сланы?». Мультфільмы.
13.10. Тэлемікст.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Гэта было... было...
14.40. «Залатая міна». Маст. фільм. 1-я серыя.
15.45. Дзіцячы музычны клуб.
16.25. Студыя «Палітыка» паказвае...
17.00. Навіны.
17.20. ...Да 16 і старэйшым.
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.45. Аўтарская праграма Э. Разанава «Размова на свежым паветры». Частка 1-я «Васіль Аксёнаў».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.50. «Непрадбачаныя візіты». Маст. фільм. 4-я серыя.
22.15. «Ялта-92». Дзень 3-ці.
23.00. Навіны.
23.35. Працяг конкурсу «Ялта-92».
1.30. «Залатая міна». Маст. фільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. У пошуках сябе.
8.50. Вольны час. «Увага: здымаю!»
9.05. Дакументальная панарама. «Тры дні ў жніўні».
9.50. Рускія песні і рамансы.
10.15. Надзвычайная сітуацыя.
11.00. «Перамена лёсу». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00 Бізнес — новыя імёны.
15.15. Сігнал.
15.30. Пілігрым.
16.30. Там-там навіны.
16.45. Музыка старажытнага Ноўгарада.
17.00. Далёкі Усход.
17